

БАЛЬНІЦЫ ВЯРТАЮЦЦА ДА ЗВЫЧАЙНАГА РЭЖЫМУ **3**

ЯК НАШЫ ПРОДКІ ЗБІРАЛІСЯ НА БАЛЬ **8**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 СТУДЗЕНЯ 2021 г. СУБОТА № 8 (29377)


**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Алена СІНІЦКАЯ, педагог Шумілінскай дзіцячай школы мастацтваў, дэлегат Усебеларускага народнага сходу:**

*«Дзецям з глыбінкі трэба даць шанц праявіць свае таленты ў розных творчых конкурсах рэспубліканскага ўзроўню, а значная роля ў станаўленні і развіцці адоранай моладзі адводзіцца настаўнікам... Мы, настаўнікі, павінны не проста своечасова заўважыць іскру таленту ў дзіцяці, але і дапамагчы разгарэцца ёй у агні творчасці. Таленавітыя асобы, як паказвае статыстыка, не сканцэнтраваныя выключна ў вялікіх гарадах, яны ёсць па ўсёй краіне. Менавіта таму трэба прыцягваць дзяцей з раённых і сельскіх школ да ўдзелу ў розных спаборніцтвах. Для іх гэта можа стаць свайго роду загартоўкай на будучыню».*

# Гаспадар Маразоў



**Адзіны дом у вёсцы Маразы Вілейскага раёна, які паўнавартасна «жыве» круглы год, належыць сям'і Уладзіміра ФУРСА. Калі летам дачнікі яшчэ наведваюць сваю малую радзіму, дык зімою толькі Уладзімір Леанідавіч, можна сказаць, застаецца гаспадаром паселішча. Але марозавец не сумуе — цішыня і спакой яму даспадобы, а яшчэ і прыгажосць навідавоку: абапал вёскі густы лес! А наконт моцных маразоў, якія абяцаюць сіноптыкі, спадар Фурс не турбуецца — у яго дыхтоўны і ўтульны дом, які мужчына сам некалі пабудаваў.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- У Беларусі амаль 26 % работнікаў атрымліваюць зарплату Br1–1,5 тысячы.
- **Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі ўнесла ва ўрад пакет прапаноў па ўдасканаленні пенсійнай сістэмы.**
- Нацбанк падоўжыў тэрмін прыпынення пастаянна даступных аперацый рэгулявання ліквіднасці.
- **Завод па перапрацоўцы ПЭТ-бутэлек плануюць пабудаваць у Пінскім раёне.**
- У моцны мароз ДАІ рэкамендуе ўстрымацца ад паездак на асабістым транспарце на далёкія адлегласці.


ISSN 1990 — 763X


Жыллёвая нерухомасць

## ВЫХОДЗІМ СА СПЯЧКІ?

### З вясны кватэры на «другасным рынку» пачнуць заўважна таннець

**Асенні рынак нерухомасці аказаўся амаль паралізаваны — кватэры практычна не прадавалі і не куплялі з-за працягу пандэміі каранавіруса, ды і сусветны эканамічны крызіс нагадаў пра сябе. Узімку здзелак па-ранейшаму мала, хоць у снежні іх было крыху больш, чым у лістападзе. Кожны раз ёсць людзі, якія хочуць сустрэць Новы год у новай кватэры. Але ў гэтым сезоне такіх шчаслівчыкаў было мала.**

**Студзень звычайна і ў добрыя гады не самы актыўны месяц, а ў цяжкія часы ён наогул «спіць». А ў спецыялістаў няма пакуль нават падстаў меркаваць, што гэтай зімой пакупнікі выйдуць са спячкі. Тым больш цэны прадаўцы працягваюць трымаць.**

### ПАЧАТАК 2021-га ЯК ПРАЦЯГ 2020-га

**Дырэктар Агенцтва нерухомасці «БелЦТН» і ганаровы старшыня ГА «Беларуская асацыяцыя «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ** расказаў, што ў выніку зніжэння попыту ў 2020-м агенцтвы нерухомасці ў параўнанні з мінулым годам страцілі 20—30 % сваіх даходаў. «Гэта з улікам таго, што рэнтабельнасць рыэлтарскага бізнесу невысокая і складае 5—10 %», — тлумачыць спецыяліст.

З апошніх негатыўных з'яў — поўнае прыпыненне крэдытавання куплі жылля на другасным рынку. Гэта падарвала фінансавыя магчымасці пакупнікоў. Цяпер на рынку іх мала, і даводзіцца вельмі актыўна таргавацца. Да таго ж, здзелкі часта адкладаюцца з-за хваробы прадаўцоў і пакупнікоў.


СТАР. 4


Што пачым?

## СІМВАЛ ЖЫЦЦЯ НА НАШЫМ СТАЛЕ

### Мы даведаліся, колькі сёння каштуюць яйкі курэй, перапёлак і іншых птушак і што новага прапануе пакупніку рынак

**Яйкі — у першую чаргу курыныя — адзін з ключавых прадуктаў харчавання ў нашай краіне. Дзясятак яек уваходзіць практычна ў любы спіс прадуктаў, калі мы адпраўляемся ў краму. Гэта ідэальны сняданак, інгрэдыент для тысяч страў, аснова многіх дыет і ўнікальны прадукт, які змяшчае амаль усе неабходныя нашаму арганізму вітаміны, макра- і мікраэлементы. Як заўсёды, у нашай рубрыцы мы высвятляем асартымент і цэны на гэты прадукт на сённяшні дзень. А таксама параімся з прадаўцамі: на што звярнуць увагу падчас выбару яек.**





СТАР. 5

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Трэба знаходзіць магчымасці крэдытавання рэальнага сектара эканомікі»

**Такую ўстаноўку даў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладам старшыню праўлення Нацыянальнага банка краіны Паўла Калаура.**

Кіраўнік дзяржавы папярэдзіў, што ў найбліжэйшы час з кіраўніцтвам урада і пэўных галін эканомікі краіны будуць разгледжаныя вынікі мінулага года, у тым ліку дзейнасць фінансавага сектара.

«Таму хацелася б сёння акцэнтаваць увагу на ключавых момантах работы Нацыянальнага банка, — сказаў ён. — Перш за ўсё цікавіць сітуацыя з золатавалютнымі рэзервамі. Па інфляцыі мы трохі перавысілі запланаваны ўзровень. Хацелася б пачуць тлумачэнне ў сувязі з гэтым. Банальныя рэчы я чытаю і слухаю, але хацелася б глыбей зірнуць на гэтую праблему».

***Цэнавая стабільнасць — пытанне нумар адзін,*** падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён пацікавіўся сітуацыяй у банкаўскай сферы і падзякаваў кіраўніку галоўнага фінансавага рэгулятара краіны за тое, што ў няпросты час банкаўская сістэма не проста вытрымала, але і засталася здольная аказваць падтрымку нацыянальнай эканоміцы.

***«Эканоміка павінна развівацца. Калі эканомікі не будзе, не будзе і банкаўскай сістэмы, ды яна нікому і не спатрэбіцца.*** І ў людзей не будзе грошай. Таму эканоміка — перш за ўсё», — дадаў беларускі лідар. Трэба знаходзіць магчымасці крэдытавання рэальнага сектара эканомікі, адзначыў кіраўнік краіны, назваўшы гэта пытанне фундаментальным.

Закранаючы тэму санкцыйнага ціску, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на іх чыста палітычны падтэкст. «Няма прычын, каб супраць нас уводзілі санкцыі. Нас душылі і будуць душыць, — сказаў ён. — ***Мы павінны навучыцца супрацьстаяць гэтаму. Гэта ўжо, напэўна, трэці або чацвёрты этап па ўдушэнні эканомікі і нашай дзяржаўнасці. Трэба глядзець на свет шырэй. Свет не клінам сышоўся на Еўрасаюзе.*** Хоць і яны ж разумеюць, што каля трох тысяч прадпрыемстваў рознага роду функцыянуе і завязана на Беларусь. І абвалу ў Беларусі ніхто не хоча, бо гэта (выклікае. — **«Зв.»**) пэўныя праблемы ў самім Еўрапейскім саюзе».

Трэба працаваць з усімі: і з еўрапейцамі, і з амерыканцамі, але ёсць і азіяцкі рынак, і грошай зараз у свеце дастаткова, таму трэба працаваць і прыцягваць фінансавыя рэсурсы ў краіну, дадаў Аляксандр Лукашэнка.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ❍ У тэму

Нацыянальны банк і ўся банкаўская сістэма краіны летась вырашалі дзве важныя і ўзаемазвязаныя задачы, расказаў журналістам па выніках даклада кіраўніку дзяржавы Павел Калаур. Першая — аказанне падтрымкі ўсёй эканоміцы праз крэдытаванне і суправаджэнне экспарту беларускіх вытворцаў. Другая — захаванне макраэканамічнай збалансаванасці ва ўмовах сусветнага крызісу, уплыву надзвычай негатыўных фактараў, у тым ліку абясцэньвання нацыянальных валют у асноўных гандлёвых партнёраў, перш за ўсё, у Расійскай Федэрацыі. Гэтыя задачы былі вырашаныя, лічыць Павел Калаур.

«Мы захавалі фінансавую стабільнасць. Вядома, пры гэтым атрымалі абясцэньванне нацыянальнай валюты, але я б хацеў яшчэ раз заўважыць, што гэты працэс быў аб'ектыўна абумоўлены фактарамі, з якімі сутыкнулася наша эканоміка, — падкрэсліў кіраўнік праўлення Нацбанка. — Самае прынцыповае, што пры гэтым мы маем роўнаўзважаны рынкавы курс. Мы не назапасілі дысбалансаў, якія аказвалі б негатыўны ўплыў на плацежны баланс або, адпаведна, на валютны рынак на працягу года».

Рэальны эфектыўны курс нацыянальнай валюты (адносна валют асноўных гандлёвых партнёраў на працягу года) знізіўся на 5 %, сказаў Павел Калаур і дадаў, што была аказаная падтрымка цэнавых умоў беларускіх экспарцёраў.

«Так, мы маем некаторае зніжэнне прыбытку банкаўскай сістэмы — на 13,5 % у параўнанні з папярэднім перыядам, — заўважыў ён. — Адпаведна, упала рэнтабельнасць нарматыўнага капіталу на два працэнтныя пункты. Але ў прынцыпе рэнтабельнасць банкаўскага сектара — 8,9 %, гэта добрая рэнтабельнасць для таго, каб была забяспечаная ўстойлівасць».

Важна, што актывы, якія не абслугоўваюцца (4,8 % крэдытнага партфеля банкаўскай сістэмы), захаваліся на ўзроўні пачатку мінулага года, адзначыў Павел Калаур.

«Адпаведна, дастатковасць нарматыўнага капіталу ўсёй банкаўскай сістэмы складае 17 % пры патрабаванні ў 12,5 %. Мы бачым, што ёсць пэўная трываласць, і я б сказаў, нават значны запас трываласці, каб банкі маглі не толькі ўстойліва працаваць, але і надалей аказваць падтрымку нашай эканоміцы», — паведаміў старшыня праўлення Нацбанка.

Асноўныя кірункі грашова-крэдытнай палітыкі на бягучы год, дзе вызначаныя галоўныя параметры падтрымкі рэальнага сектара эканомікі з боку банкаўскай сферы, ужо зацверджаныя, нагадаў Павел Калаур.

«Ключавы прамежкавы арыенцір — шырокая грашовая маса, і мы гэты параметр, безумоўна, будзем вытрымліваць, — запэўніў ён. — Ад гэтага залежыць і рост крэдытаў для эканомікі. Мы сутыкнуліся з тым, што летась адбылося адцягненне дэпазітаў і ў замежнай, і ў нацыянальнай валютах, што негатыўна паўплывала на шырокую грашовую масу. Гэты паказчык крыху ніжэйшы, чым мы яго прагназавалі».

Разам з тым, рэсурсы ў нацыянальнай валюце, якія сышлі з гэтай прычыны з эканомікі, былі замешчаныя грашыма Нацыянальнага банка, каб падтрымаць ліквіднасць банкаўскай сістэмы.

«У выніку гэта лічба вырасла да двух мільярдаў рублёў, і мы мяркуем сёлета ў гэтых межах падтрымліваць ліквіднасць банкаўскай сістэмы з тэрмінамі да 6 месяцаў, — праінфармаваў старшыня праўлення Нацбанка журналістаў. — Гэта будзе рабіцца на аўкцыённай аснове на працягу года раўнамерна і разам з іншымі аўкцыённымі аперацыямі дазволіць падтрымліваць ліквіднасць банкаўскай сістэмы і крэдытаванне эканомікі».

Рэгулятар намераны аднаўляць зберагальны працэс, каб умовы для дэпазітаў у нацыянальнай валюце зноў сталі прывабнымі і каб захоўвалася пакупная здольнасць (гэта значыць, каб працэнтныя стаўкі былі вышэйшыя за ўзровень інфляцыі), сказаў Павел Калаур.

# «Вучоным года НАН Беларусі — 2020» стаў хімік



**Гэта званне было прысвоена загадчыку аддзела Інстытута хіміі новых матэрыялаў НАН, доктару хімічных навук, прафесару, акадэміку Уладзіміру АГАБЕКАВУ.**

Вучоны быў узнагароджаны за значны асабісты ўклад у развіццё навуковых даследаванняў і стварэнне перспектыўных навукаёмістых распрацовак у галіне малатанажнай хіміі, умацаванне міжнароднага аўтарытэту Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дасягненні ў падрыхтоўцы навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Пад яго кіраўніцтвам створаны нанакаталізатары новага пакалення для сінтэзу злучэнняў, якія валодаюць высокай біялагічнай актыўнасцю, у адпаведнасці з крытэрыямі «зялёнай» хіміі (нізкая тэмпература рэакцыі, адсутнасць растваральнікаў, выкарыстанне прыроднай сыравіны).

Уладзімір Агабекаў — вядомы ў Беларусі і за мяжой вучоны ў галіне малатанажнай хіміі, аўтар звыш тысячы навуковых работ, у тым ліку пяці манаграфій, 170 аўтарскіх пасведчанняў і патэнтаў. Больш за 20 гадоў ён нязменна ўзначальваў Інстытут хіміі новых матэрыялаў НАН. Сярод кірункаў яго навуковых даследаванняў — аднаўляльныя крыніцы энергіі, мясцовыя і другасныя энергарэсурсы, новыя шматфункцыянальныя матэрыялы, спецыяльныя матэрыялы з зададзенымі ўласцівасцямі, оптаэлектроніка і аптычныя сістэмы, вытворчасць новых хімічных прадуктаў, нанатэхналогіі, устойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў і ахова навакольнага асяроддзя.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота lesgazeta.by.**

# ГАРМОНІЯ Ў ЭКАНОМІЦЫ

## Медыятыўныя пагадненні па камерцыйных спрэчках на міжнародным узроўні з 15 студзеня запрацавалі ў Беларусі

**У краіне ўступіла ў сілу Канвенцыя ААН аб міжнародных міравых пагадненнях, якія дасягнуты ў выніку медыяцыі (Сінгапурская канвенцыя). Пры гэтым для суб'ектаў гаспадарання перавагай з'яўляецца магчымасць прымусовага выканання дакумента ў дзяржавах-удзельніцах, паведамляецца на сайце Мінюста.**

На міжнародным узроўні заключэнне і прымяненне Канвенцыі азначае павышэнне канкурэнцыі паміж асноўнымі працэдурамі вырашэння спрэчак, адзначаюць у міністэрстве. Канвенцыя замацоўвае абавязкі па прызнанні медыятыўных пагадненняў у дзяржавах-удзельніцах.

Апрача таго, з 15 студзеня пачне дзейнічаць і закон «Аб змяненні законаў па пытаннях медыяцыі», якім прадугледжана карэкціроўка заканадаўства дзеля рэалізацыі Канвенцыі ў нашай краіне. З гэтай мэтай у Беларусі ўведзена паняцце «міжнароднае медыятыўнае пагадненне» і працэдура яго заключэння. Гаспадарчы працэсуальны кодэкс дапоўнены прававымі нормамі аб прызнанні і выкананні міжнародных медыятыўных пагадненняў, аб адмове ў прававой дапамозе па дадзенай катэгорыі спраў, аб забеспячэнні прадмета міжнародных медыятыўных пагадненняў.

Яшчэ раней нормы па выплаце дзяржпошліны за разгляд судом спраў у дачыненні да міжнародных медыятыўных пагадненняў, прыняцці забеспячальных мер па іх (дзесяць базавых велічынь), пытаннях падаткаабкладання былі ўрэгуляваны законам «Аб змяненні Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь» і таксама ўступілі ў сілу 15 студзеня.

Распрацоўшчыкі Сінгапурскай канвенцыі зыходзілі з таго, што выкарыстанне медыяцыі дае істотныя перавагі — у прыватнасці, змяншае колькасць выпадкаў, падчас якіх спрэчка прыводзіць да спынення камерцыйных адносін; спрашчае ажыццяўленне міжнародных аперацый удзельнікамі камерцыйнай дзейнасці; дазваляе дасягаць эканоміі ў працэсе здзяйснення правасуддзя дзяржавамі. Акрамя таго, лічыцца, што стварэнне асновы для выканання міжнародных міравых пагадненняў, дасягнутых у выніку медыяцыі, прымальнай для дзяржаў з рознымі прававымі, сацыяльнымі і эканамічнымі сістэмамі, садзейнічае развіццю гарманічных міжнародных эканамічных адносін.

**Ірына СІДАРОК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Францыі ўведзена каменданцкая гадзіна



Прэм'ер-міністр Францыі Жан Кастэкс заявіў, што з 16 студзеня ўлады ўводзяць у краіне каменданцкую гадзіну з-за распаўсюджвання каранавіруса. Кіраўнік французскага ўрада прызнаў, што вірус працягвае «імкліва распаўсюджвацца па ўсёй краіне». Перыяд пасля навагодніх свят вызначыўся новым пагаршэннем эпідэмічнай абстаноўкі. Жыхарам забаронена пакідаць свае дамы пасля 18.00. Па словах французскага прэм'ера, абмежаванні ўводзяцца на тэрмін не менш чым 15 дзён. Жан Кастэкс растлумачыў, што абмежаванні ўводзяцца з-за распаўсюджвання «англійскага» штама каранавіруса. Акрамя таго, французскія ўлады плануюць узмацніць кантроль над тымі, хто ўязджае ў краіну з-за межаў ЕС, — яны павінны мець адмоўны вынік тэсту на ковід і прайсці двухтыднёвы каранцін.

## КНДР прадставіла «наймагутнейшую ў свеце зброю»

Урачысты вайсковы парад у гонар восьмага з'езду Працоўнай партыі Карэі прайшоў у Пхеньяне. Як паведамляе Цэнтральнае тэлеграфнае агенцтва Карэі (ЦТАК), на парадзе, у прыватнасці, былі прадстаўлены стратэгічныя балістычныя ракеты падводнага базіравання. «Самую магутную зброю ў свеце — стратэгічныя балістычныя ракеты падводнага базіравання — адну за адной» дэманстравалі на плошчы, «паказваючы моц рэвалюцыйных узброеных сіл» КНДР, адзначаецца ў заяве ЦТАК. Агенцтва паведаміла, што парад прайшоў на плошчы Кім Ір Сена ў цэнтры Пхеньяна пры ўдзеле лідара КНДР Кім Чэн Ына.



## У Гвінейскім заліве працвітае пірацтва



Гвінейскі заліў у мінулым годзе стаў найбольш небяспечнай зонай Сусветнага акіяна з-за пагрозы з боку піратаў. У апошнія месяцы ў гэтым рэгіёне значна ўчасціліся напады на нафтавыя танкеры. У гэтай зоне дзейнічае па меншай меры 11 узброеных груповак, члены якіх добра знаёмыя з геаграфіяй дэльты Нігера, адзначае Euronews. Летась піраты выкралі каля 150 членаў экіпажаў. Паводле ацэнак Міжнароднага бюро суднаходства, на раён Гвінейскага заліва прыпадае 95 працэнтаў падобных выкраданняў у свеце. Большасць такіх здарэнняў адбываецца ў тэрытарыяльных водах Нігерыі.

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні родным і блізкім СТАНЕВІЧА Аляксея Андрэевіча, памочніка члена Савета Рэспублікі, намесніка дырэктара КУП «Наваполацкі цэнтр прадпрымальніцтва і нерухомасці», у сувязі з яго смерцю.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні міністру прамысловасці Пятру Аляксандравічу Пархомчыку ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю МАЦІ.**

Слова — удзельнікам




# Маладым трэба вучыцца адказнасці

**Беларусы сёння актыўна вызначаюцца з дэлегатамі на Усебеларускі народны сход. На абмеркаванне ўдзельнікаў будуць вынесены асноўныя палажэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2021—2025 гады і кірункі грамадска-палітычнага развіцця краіны. «Звязда» вырашыла пазнаёміць чытачоў газеты з Таццянай ЗАХОЖАЙ з вёскі Юцкі Дзяржынскага раёна, якую вылучыў дэлегатам прэзідыум Беларускага саюза жанчын.**



«Я хоць і працую яшчэ, але ўсё ж пенсіянерка, — сказала жанчына.— У мяне ўжо ёсць такі досвед — быць дэлегатам на Сходзе, і для мяне гэта гонар. Спадзяюся, што мой жыццёвы вопыт будзе карысны».

Нарадзілася Таццяна ў шматдзетнай сям'і ў вёсцы Пагост Бярэзінскага раёна. Маці працавала на ферме даяркай, бацька — інвалід.

«Нас было пяцёра дзяцей, і маці прыходзілася працаваць адной, — успамінае Таццяна Уладзіміраўна.— Памятаю, мне было восем гадоў, а я ўжо дзвюх кароў даіла на ферме, каб ёй дапамагчы...»

Пасля 8-га класа паступіла ў Смілавіцкае СПТВ № 23 па спецыяльнасці «трактарыст-машыніст шырокага профілю». Маці, канешне, адгаворвала, маўляў, будзе няпроста, але Таццяна была ўпартая і цяжкасцяў не баялася. Па размеркаванні трапіла ў Барысаўскую ДРС-25. Працавала на МТЗ-50, гусенічным трактары Т-74, нават на катку. Потым вярнулася ў родную вёску, у саўгас «Камунар».

Ёсць у Таццяны Уладзіміраўны і ордэн «Знак Пашаны», і два медалі ВДНГ СССР, і званне лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола БССР... Яна мае Усесаюзны прыз працоўнай славы імя Пашы Ангелінай — адной з першых жанчын-трактарыстак, імя якой у 1930-я гады гучала на ўвесь СССР. Міністр сельскай гаспадаркі СССР Валянцін Месяц асабіста ўручыў узнагароду жанчыне па выніках яе работы за 1981-ы, калі Захожая атрымала найлепшы ў раёне ўраджай бульбы. З апошніх жа ўзнагарод — званне «Ганаровы грамадзянін Мінскай вобласці» ў 2017-м, «Чалавек года Міншчыны» ў 2016-м, «Жанчына года» ў намінацыі «За адраджэнне вёскі» ў 2014-м ...

Таццяна Уладзіміраўна мае што прапанаваць на сходзе, і першае, аб чым неабходна гаварыць, — моладзь павінна вучыцца адказнасці.

Яшчэ дэлегат упэўнена: трэба зрабіць жыццё на вёсцы для маладых больш прывабным, каб яны не баяліся ехаць туды жыць.

«У нас дом культуры зачынілі, людзі сядзяць па хатах, а так не павінна быць, — упэўнена жанчына. — Я з гэтым ваявала яшчэ ў маладосці. У нас быў клуб, які працаваў толькі да 23:30 у выхадныя. А маладым хочацца танцаваць... Калі моладзь нічым занятая не будзе, то яна выйдзе на вуліцу, а там і да пабітых ліхтароў недалёка».

Яшчэ адной праблемай вёскі, на думку дэлегата, стаў транспарт. Нягледзячы на тое, што Юцкі знаходзяцца недалёка ад Дзяржынска і Мінска, аўтобус прыязджае да іх толькі два разы на дзень. І каб проста з'ездзіць на рынак ці да ўрача, трэба выклікаць таксі, а для непрацуючых пенсіянераў гэта дорага.

«Але ж, з іншага боку, дзяржаве нявыгадна вазіць па два-тры чалавекі на вялікім аўтобусе, — разважае Таццяна Уладзіміраўна. — Таму выйсце, зноў жа, толькі адно — прыцягваць у вёску моладзь, каб яна палюбіла працу на зямлі. Цяпер нямала для гэтага робіцца, ёсць імкненне зрабіць для жыхароў вёсак больш камфортныя ўмовы. І дарогі асфальтуюць, і ЖКГ стараецца добраўпарадкаваць месцы агульнага карыстання, і заробкі павышаюць. Напрыклад, працаваць трактарыстам на вёсцы вельмі ганарова, адпачынак даволі доўгі — 35 дзён. Заробкі ў нас цяпер таксама дастойныя, можна пад тысячу рублёў атрымаць. Для горада гэта, вядома, невялікія грошы, але тут, у нас, цалкам жыць можна. Хоць працуем часта без выхадных, па 10-12 гадзін, але гэта таксама па жаданні. Хочаш зарабіць — то і працаваць трэба нямала».

Таццяну Уладзіміраўну турбуе і дэмаграфічная сітуацыя ў краіне, бо дзяцей у вёсках няма і школы там зачыняюцца.

«Ведаю, што дзяржава шмат у чым дапамагае бацькам з дзецьмі, — гаворыць дэлегат. — Мой сын стаяў шмат гадоў на чарзе, пакуль не нарадзілася трэцяя дачка. А там ужо на працягу года і прапанавалі пабудавацца. Самі разумееце, уласнае жыллё вельмі сур'ёзны стымул для маладых сем'яў, але трэба і надалей матываваць людзей нараджаць дзяцей».

Таццяна Уладзіміраўна згадвае, што перажыла шмат цяжкасцяў у 90-я гады. У параўнанні з імі сёння жывецца добра. Дэлегат спадзяецца, што дзяржаўная праграма развіцця на будучую пяцігодку, як і ў мінулыя гады, будзе распрацавана з разлікам на дабрабыт людзей і ўпэўненае развіццё краіны.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Добрыя навіны

# ВА ЎМОВАХ ПАНДЭМІІ

## Камп'ютарныя тамографы паступілі ў бальніцы Гродзеншчыны, а сталічныя медустановы паступова вяртаюцца да планавай работы

**Камп'ютарныя тамографы прыбылі ў бальніцы Ліды, Нясвіжа і Навагрудка. Гэта абсталяванне дазволіць убачыць карціну захворвання ў 64-кратным зрэзе, што нашмат палепшыць дакладнасць дыягностыкі, паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя.**

Абсталяванне маркі «Сіменс» закуплена па лініі Міністэрства аховы здароўя за кошт сродкаў пазыкі Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця. Нагадаем, летам мінулага года была падпісана Дамова аб пазыцы ў памеры 90 мільёнаў еўра на рэалізацыю праекта па экстранным рэагаванні на COVID-19 у Беларусі «Belarus Emergency COVID-19 Response Project». Кошт аднаго тамографа — 772,5 тысячы рублёў.

Ва ўмовах пандэміі вырасла актуальнасць камп'ютарнай тамаграфіі лёгкіх, якая дазваляе ўстанавіць дыягназ COVID-19. З дапамогай КТ можна правесці дыягностыку практычна ўсяго арганізма — праверыць хворыя суставы і органы, пацвердзіць наяўнасць ці адсутнасць новаўтварэнняў.

Нагадаем, што напярэдадні 2021 года апараты КТ атрымалі бальніцы Брэсцкай вобласці. Яны былі дастаўлены ў медустановы Кобрына, Бярозы і Століна.

Між тым, цяперашні ўзровень захваральнасці на COVID-19 дазваляе вывесці некаторыя стацыянары з рэжыму работы інфекцыйных. У прыватнасці, сталічны раддом № 2 плануецца адкрыць для планавай работы 25 студзеня. Гэта ўстанова была перапрафілявана пад прыём хворых з COVID-19 у канцы мінулага года. З сярэдзіны гэтага тыдня і да 24 студзеня ў раддоме праходзіць маштабная санітарная апрацоўка вызваленых плошчаў. Яе праводзяць ваенныя з батальёна радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай аховы Мінабароны.

У сталічнай гінекалагічнай бальніцы таксама спынены прыём пацыентаў з каранавіруснай інфекцыяй. Прыкладна з 19 студзеня тут таксама пачнецца маштабная санітарная апрацоўка, а з 25 студзеня плануецца яе адкрыццё для планавай работы.

Магчыма, вернуцца да звычайнага фармату яшчэ дзве сталічныя бальніцы — дзіцячая інфекцыйная бальніца (аднosна шпіталізацыі дарослых пацыентаў) і 1-я гарадская клінічная бальніца.

За апошнія суткі ў Беларусі зарэгістравана 1 тысяча 941 новы выпадак COVID-19. Выпісана 2054 пацыенты. Усяго з пачатку пандэміі ў Беларусі захварэлі 221 604 чалавекі. Папраравіліся 204 500 пацыентаў, у якіх раней быў пацверджаны дыягназ COVID-19. За ўвесь перыяд распаўсюджання інфекцыі на тэрыторыі краіны памерлі 1564 пацыенты з выяўленай каранавіруснай інфекцыяй, у тым ліку дзесяць — за апошнія суткі.

**Алена КРАВЕЦ.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ

## ІНТЭРНЭТ-РЭСУРС У ДАПАМОГУ НАСТАЎНІКАМ

**З пачатку студзеня ў тэставым рэжыме пачаў працаваць новы кампанент вучэбна-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі — адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс eior.by.**

У цяперашні час на ім размешчаны матэрыялы па ўсіх вучэбных прадметах для трэцяй чвэрці — камплекты вучэбна-метадычных матэрыялаў па ўсіх вучэбных прадметах, якія ўключаюць відэафрагменты з тлумачэннем навучальнага матэрыялу і тэставыя заданні для самакантролю ведаў і ўменняў.

Да распрацоўкі навучальных матэрыялаў прыцягнуты найлепшыя настаўнікі з усіх рэгіёнаў Беларусі. Кансультаванне распрацоўшчыкаў, каардынацыю іх дзейнасці і метадычную экспертызу распрацаваных навучальных матэрыялаў забяспечваюць спецыялісты Нацыянальнага інстытута адукацыі і Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. У лік экспертаў уваходзяць аўтары дзеючых навучальных дапаможнікаў для навучэнцаў, дапаможнікаў для настаўнікаў, навукоўцы і метадысты. Тэхнічную падтрымку рэсурсу ажыццяўляе Галоўны інфармацыйна-аналітычны цэнтр Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

На дадзены момант завяршаецца экспертыза матэрыялаў для чацвёртай чвэрці.

У студзені-лютым плануецца правядзенне вэбінараў для педагогаў па пытаннях выкарыстання дадзенага рэсурсу.

Прапановы па ўдасканаленні рэсурсу можна накіроўваць на інфалінію Нацыянальнага адукацыйнага партала (adu.by).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ВІРТУАЛЬНЫ ШЧАНЮК ЗА 2 000 ДОЛАРАЎ

Адзін са спосабаў вымантачвання грошай у інтэрнэце — перадаплата. Пра чарговую такую гісторыю паведаміла УУС Брэсцкага аблвыканкама. У гэты раз пацярпелай апынулася 29-гадовая грамадзянка Расійскай Федэрацыі, якую



падманулі на інтэрнэт-пляцоўцы аб'яў, дзе жанчына размясціла запыт аб куплі шчанюка бульдога.

Неўзабаве з ёй звязаўся «ўладальнік» такога сабакі, прадаставіўшы фатаграфіі жывога тавару. У ходзе перапіскі мужчына сказаў зрабіць перадаплату, пасля чаго ён пачне арганізацыю дастаўкі шчанюка пакупніцы. Аднак, атрымаўшы грошы, запатрабаваў перавесці і астатнюю суму. Пацярпелая, заплаціўшы 2 000 долараў, чакала абяцаную пасылку. Ішоў час, а ўмовы здзелкі выкананыя не былі, і жанчына звярнулася ў міліцыю.

Аператыўнікі Брэсцкага і Жабінкаўскага РАУС высветлілі асобу віртуальнага злачынца. Ім аказаўся 34-гадовы жыхар Брэста, які вырашыў зарабіць, выкарыстоўваючы анлайн-прастору. Шчанюк аказаўся выдуманым, а прадастаўленыя фатаграфіі выкарыстоўваліся толькі ў якасці ілюстрацыі. Мужчына, атрымаўшы апавяшчэнне аб грашовым пераводзе і спрабуючы «замесці сляды», спецыяльна ездзіў у Жабінку, каб забраць грошы. Ілжэпрадавец растлумачыў, што частку грошай ён згубіў, а другую ўжо выдаткаваў на ўласныя патрэбы.

## ПІРАТЭХНІКА НА МІЛЬЁН

У двух грузавіках замест папяровых канфеці мытнікі выявілі 690 тысяч адзінак піратэхнічных вырабаў бытавога прызначэння коштам звыш мільёна рублёў.

Супрацоўнікі Брэсцкай мытні знайшлі гэты тавар у канцы мінулага года, калі ён незаконна ўвозіўся з Украіны ў Беларусь. Праз пункт пропуску «Макраны» на адрас фірмы-атрымальніка, размешчанай на тэрыторыі Мінскага раёна, накіроўваліся транспартныя сродкі SCANIA і RENAULT з таварамі народнага спажывання. Пры ідэнтыфікацыі тавараў мытнікі ўстанавілі, што замест указаных у дакументах папяровых канфеці ў грузавых адсеках паўпрычэпаў знаходзіцца больш чым 690 тысяч незадэклараваных навагодніх хлапушак розных найменняў. Акрамя таго, у адным з транспартных сродкаў колькасць навагодніх цацак на дзве тысячы адзінак перавышала заяўленыя даныя.

Па выніках заключэння эксперта цэнтральнага апарата Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь, атрыманага ў студзені, устаноўлена, што незадэклараваныя хлапушкі з'яўляюцца піратэхнічнымі вырабамі бытавога прызначэння забаўляльнага характару. У адпаведнасці з заканадаўствам, завезці на тэрыторыю Беларусі піратэхнічныя вырабы могуць толькі індывідуальныя прадпрымальнікі і юрыдычныя асобы пры наяўнасці дазвольных дакументаў, якія выдаюцца Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях, — і, адпаведна, задэкларававшы іх. Паводле папярэдняй ацэнкі, агульны кошт тавару, які незаконна перамяшчаўся, склаў звыш мільёна рублёў. Ён канфіскаваны да рашэння суда, Брэсцкай мытняй праводзіцца праверка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ВЫХОДЗІМ СА СПЯЧКІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Што датычыцца пакупнікоў, якія ўсё ж прыходзяць на рынак, часцей за ўсё яны разглядаюць самыя танныя прапановы кватэр і набываюць іх, у тым ліку, з мэтай укласці грошы. На рынку ёсць здзелкі куплі-продажу і дарагіх кватэр, цэны на якія за апошнія месяцы знізіліся, і яны сталі прывабныя для пакупнікоў. Але самы вялікі сегмент рынку — кватэры стандартных спажывецкіх якасцяў.

Зараз на рынку захоўваецца ўсяго адзін станоўчы трэнд. Некаторыя банкі яшчэ крэдытуюць новабудоўлі па партнёрскіх праграмах з забудоўшчыкамі. Таму ёсць катэгорыя людзей, якія прадаюць свае старыя кватэры і наўзамен купляюць новыя з прыцягненнем крэдытных сродкаў. Гэта часткова ажыўляе рынак.

Сітуацыя на рынку ўскладняецца тым, што з пачаткам жніўня патэнцыйныя пакупнікі з рэальнымі фінансамі занялі пазіцыю чакання. На гэта паўплывала нявызначанасць і неразуменне таго, што будзе далей.

Людзі практычна не цікавіліся жыллём на працягу паўгода. Цяпер кліенты ўжо разумеюць, што крызісная сітуацыя зацягнецца і чакаць, мабыць, не варта. Мікалай Прасталупаў у гэтай сітуацыі адзначае, што, нягледзячы на багацце выстаўленых на продаж кватэр, цяпер выбраць прыдатны варыянт пакупнікам вельмі складана. Годных варыянтаў па суадносінах кошту і якасці на рынку вельмі мала. Яны калі і з'яўляюцца, то сыходзяць літаральна за лічаныя дні.

## КУПЛЯЦЬ НЯМА КАМУ

Зараз на продаж у Мінску выстаўлена каля 10 тысяч кватэр, гэта на 20 % больш, чым звычайна. Атрымліваецца, што прапаноў шмат, а купляць няма каму?

**Эксперт па жылой нерухомасці Наталля ЛІТОЎСКАЯ** лічыць, што купляць якраз ёсць каму — толькі з укладаў беларусы восенню знялі і паклалі пад падушку 1,5 мільярда долараў. Не купляюць з дзвюх прычын: эканамічная сітуацыя не выклікае аптымізму і няма жадання ўкладваць грошы ў бетонныя метры. Ды і кошт метра цяпер яшчэ высакаваты: гэта значыць, сёння не купіў — лічы, сэканоміў. Прадаўцы, у сваю чаргу, спрабуюць прадаць даражэй, таму што большасці з іх хочацца збыць маленькую кватэру і купіць нешта прастарнейшае і, пажадана, без даплаты.

Цяпер сітуацыя на рынку такая, што з «чыстымі» грашыма прыходзіць максімум 10 % ад агульнай колькасці пакупнікоў. Асноўная частка кліентаў — гэта прадаўцы, якія адначасова з'яўляюцца і пакупнікамі. А ім чакаць і спадзявацца на тое, што праз пару месяцаў яны купяць кватэру на дзве–тры тысячы долараў танней, чым цяпер, не варта, бо сваю кватэру давядзецца таксама прадаць па больш нізкай цане.

Пакупнікі з «чыстымі» грашыма, вядома, могуць і не спяшацца. Але яны не вызначаюць сітуацыю на рынку. Гэта, як правіла, прадпрымальнікі, у якіх таксама знізіліся заробкі. На жаль, у існуючых умовах яны будуць выходзіць на рынак не так актыўна, як гэта было ў мінулыя гады, па меншай меры, да лета 2021 года, пакуль не наступіць поўная яснасць з каранавірусам, эканомікай і палітыкай.

## 500 ДОЛАРАЎ «КВАДРАТ»? ТАКОГА НЕ БУДЗЕ!



Нягледзячы на складаную эканамічную сітуацыю, прадаўцы ўсё роўна трымаюць цэннікі на ўзроўні мінулага года. Цяпер рынак застыў у тым ліку і з гэтай прычыны. Разглядаючы перспектывы другаснага рынку жылля на першае паўгоддзе, Мікалай Прасталупаў адзначыў, што да красавіка тэндэнцыя на зніжэнне цэн захаваецца. Яны, як і цяпер, будуць падаць прыкладна ад аднаго да двух працэнтаў у месяц у рэальных здзелках. На думку нашага эксперта, ужо ў красавіку—маі пачнецца актывізацыя, а да лета рынак адновіцца і выйдзе на ўзровень 2019 года. З улікам адкладзенага попыту ёсць надзея, што сітуацыя будзе нават лепшая, чым летась.

Не такі аднязначны аналіз сітуацыі ад эксперта Літоўскай. На яе думку, цяпер сярэдні цэннік прапаноў — каля 1300 долараў у рублёвым эквіваленце за квадратны метр. Гэта жаданне прадаўцоў так прадаць сваю кватэру, а не рэальныя здзелкі. На самай справе купляюцца самыя танныя кватэры і аб'екты, у якіх прадавец прапанаваў добрую зніжку. Якія цэны будуць да восені 2021-га, прадказаць складана. Можна апісаць толькі вектар — рухаемся да 1000 долараў за квадратны метр. І нават калі каранавірусны крызіс вырашыцца, вектар не зменіцца.

Яшчэ існуе адно цікавае пытанне: як рухаецца крывая сярэдняй цаны на метры падчас крызісаў? Тут можна правесці аналогію з апошнім важкім крызісам на жыллёвым рынку краіны 2015—2016 гадоў. У той час цэны некалькі месяцаў трымаліся, быццам нічога не адбылося, а ў пачатку 2016-га пачалі падаць у сярэднім на 30—50 долараў за квадратны метр у месяц. Пакуль можна канстатаваць, што з красавіка мінулага года, калі быў чарговы пік цэн, сярэдні цэннік упаў на 150 долараў за квадратны метр. Гэта значыць цэны зніжаюцца на 20 долараў у месяц. Спадарыня Літоўская мяркуе, што да вясны хуткасць падзення павялічыцца да 30—50 долараў на месяц.

Цікава, як угадаць, што мінімальная цана — вось яна, а далей трэба чакаць зваротнага працэсу, на падаражанне? Наш эксперт лічыць, што цэнавае дно ў кожнага тыпу кватэр сваё. Напрыклад, калі гаворка ідзе пра старое жыллё, пабудаванае пры СССР, якое не бачыла капрамонту, цэнавае дно можа быць і ніжэй тысячы долараў. Калі гаворым аб доме, якому менш за 10 гадоў, яго фінансавае дно чыста псіхалагічна роўнае кошту будаўніцтва. Калі прадавец будаваў кватэру па 1300 долараў за квадратны метр, і ў адстройванне ўклаў яшчэ як мінімум 200 долараў, ён доўга не будзе гатовы прадаць жыллё танней, чым па 1500 долараў за «квадрат». Складана намацаць цэнавае дно і ў доме — «сталінцы» ў цэнтры — там, дзе гэта жыллё лічыцца элітным, і якое ў яго дно, ніхто не ведае.

Літаральна ўсіх цікавіць, якая будзе мінімальная цана на аднапакаёвую кватэру і ці будзе яна значна таннейшая, чым падобнае жыллё, нядаўна пабудаванае? Звычайна чым меншая кватэра, тым вышэй у ёй кошт квадрата. І невялікая аднапакаёвая кватэра (31—33 квадратныя метры) каля першай лініі метро будзе даражэйшая за аналагічную па характарыстыках дзесьці ў глыбіні Заводскага раёна.

Зніжэнне цэн не скончыцца ў 2021-м, можа быць першае дно, за якім рушыць услед другое. Нават эканамісты не рызыкуюць рабіць цяпер прагнозы больш, чым на год. Занадта шмат невядомага: колькі, напрыклад, будзе каштаваць долар да лета 2021-га? Якія будуць рэальныя сярэднія даходы насельніцтва?

З новабудоўлямі яшчэ складаней. Таму што ў крызісы расце рызыка даўгабуду. Калі забудоўшчык не ўмее пралічваць рызыкі, ён можа прапанаваць вельмі танныя метры, сабраць грошы і, не справіўшыся з абавязацельствамі, замарозіць будаўніцтва. Так што вельмі важна, як забудоўшчык спраўляўся з папярэднімі крызісамі, ці былі ў яго даўгабуды. Самы бяспечны варыянт — дачакацца здачы дома і купляць гатовую кватэру. Але гэты варыянт і самы дарагі.

Так, за мінулы год некалькі асеў і рынак першаснага жылля. Аднак прычынай таму сталі не каранавірус і палітычныя падзеі, а спыненне крэдытавання будаўніцтва банкамі. Людзям не стала за што будавацца. Найбольш сур'ёзны ўплыў на рынак першаснага жылля аказвае не столькі пандэмія або іншыя віды крызісу, а іх наступствы. Прычым асноўным наступствам з'яўляецца згортванне крэдытных праграм.

Цэны на новабудоўлі яшчэ трымаюцца, у асноўным за кошт партнёрскіх праграм банкаў. Хоць попыт і там даўно ніякі, крэдыт людзям з сярэднімі даходамі выдзяляюць 15—20 тысяч долараў у эквіваленце. У першым квартале 2021 года, хутчэй за ўсё, партнёрскія праграмы згорнуцца. А гэта значыць, што забудоўшчыкам прыйдзецца яшчэ да лета аб'явіць аб акцыях і зніжках хоць бы на 10 тысяч ад агульнага кошту кватэр. Зніжаны да лета да 950—1100 долараў цэннік квадратнага метра ў новабудоўлях, напэўна, прыцягне частку пакупнікоў і патэнцыйных інвестараў, якія адкладалі куплю ў чаканні дна. І гэта ненадоўга спыніць зніжэнне на другасным рынку.

Можна адзначыць толькі, што будуць запатрабаваныя новабудоўлі, якія знаходзяцца на фінальнай стадыі будаўніцтва. Людзі ў масе сваёй не дурныя і больш за ўсё не хочуць закатаць грошы ў бетон. Памятаюць, што ўсе папярэднія эканамічныя крызісы «нараджалі» даўгабуды і ў камерцыйных, і ў дзяржаўных забудоўшчыкаў.

## І АРЭНДНАЕ ЖЫЛЛЁ

У сярэднім на 10—15 % сталі таннейшыя кватэры ў Мінску, якія здаюцца ў арэнду. На думку рыэлтараў, у прыватнасці, гэта было выклікана зніжэннем узроўню жыцця насельніцтва і згортваннем турызму. Попыт на арэнднае жыллё скараціўся, пры гэтым рынак цяпер досыць насычаны. Разам з тым далёка не ўсе ўладальнікі кватэр гатовыя да зніжэння цэн. Што будзе далей?

У студзені і лютым тут усё больш-менш зразумела — цэнам расці няма з чаго. Попыт на арэнднае жыллё стабільны, але росту не прадбачыцца. Асноўныя кватаранты ў Мінску — маладыя сем'і мінчан, якія не хочуць жыць з бацькамі. Калі эканоміка сям'і пагаршаецца, даходы падаюць, яны вяртаюцца да бацькоў. Яшчэ частка кватарантаў — тыя, хто прыехаў у Мінск працаваць. Калі рэальныя даходы падаюць, людзі пераязджаюць з кватэр у пакоі, арандуюць у складчыну. А калі становіцца зусім туга — вяртаюцца на радзіму. Любімыя арандатары — айцішнікі. Але многія з іх актыўна з'язджаюць з краіны — так што і сегмент дарагіх кватэр нясе страты. Таму пакуль ёсць усе перадумовы да зніжэння цэн на арэнду.

Быў час, калі тарыф на аднапакаёвую кватэру (без рамонту) быў каля 140—160 долараў у месяц. Цяпер — 200—220 долараў. Ёсць куды зніжацца.

Што датычыцца апошніх санкцый ЕС у дачыненні да Беларусі, то, на думку экспертаў, наша краіна ў розныя гады ўжо знаходзілася пад санкцыямі. Таксама былі перыяды, калі адбывалася прыпыненне банкаўскага крэдытавання. Тым не менш здзелкі куплі-продажу не спыняліся...

**Сяргей КУРКАЧ.**

---

Кватэрнае пытанне

# Больш за 90 тысяч жылых «квадратаў» будуецца для мінчан у Чыжоўцы

# Факт і перспектывы

**Наваселля чакаюць тыя, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У пераважнай большасці гэта датычыцца шматдзетных сем'яў.**

Зараз на месцы былой вёскі Карзюкі ідзе актыўнае будаўніцтва шматпавярховікаў для чаргавікоў: два 19-павярховыя «слупкі» мапідаўскай серыі М-111-90 ужо ўпрыгожваюць гэты квартал, хутка з'явяцца некалькі 9-павярховікаў.

Як паведаміў «Звяздзе» **намеснік генеральнага дырэктара ДВА «Мінскбуд» Васіль КАСАВЕЦ**, прадпрыемства выступае заказчыкам па будаўніцтве двух жылых мікрараёнаў — Чыжоўка-6А і Чыжоўка-6. І калі ў першым агульны выгляд ужо праглядаецца — да здачы ў эксплуатацыю рыхтуюцца чатыры жылыя дамы (усяго генпланам прадугледжана восем дамоў і адзін дзіцячы садок. Заўв. **«Зв.»**), то ў другім тэхніка яшчэ не пачынала працаваць, але хутка сітуацыя зменіцца.



— У сакавіку-красавіку мы плануем распачаць будаўніцтва ў другім мікрараёне, які знаходзіцца праз дарогу ад першага, — тлумачыць суразмоўнік. — У мікрараёне Чыжоўка-6 будзе пяць жылых дамоў.

Па словах Васіля Касаўца, агульная плошча жылых «квадратаў» у гэтых мікрараёнах будзе складаць больш за 90 тысяч: каля 60 тысяч метраў квадратных у першым, 30-35 тысяч — у другім.

— Жыллё будуецца для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у асноўным гэта шматдзетныя сем'і, — акцэнтуе ўвагу суразмоўнік.

Ён удакладніў, што мікрараён Чыжоўка-6А зараз знаходзіцца ў актыўнай стадыі будаўніцтва, і на сённяшні дзень «Мінскбуд» займаецца ўводам чатырох жылых дамоў. Далей — з лютага па красавік — згодна з вызначанымі тэрмінамі будуць уводзіцца ў эксплуатацыю астатнія дамы. Паводле планаў, завяршэнне будаўніцтва гэтага мікрараёна прадугледжваецца ў другім квартале бягучага года.

Трэба сказаць, што паралельна тут развіваецца інфраструктура: праектуюцца і будуюцца вуліцы, транспартныя развязкі. Для зручнасці будучых жыхароў (акрамя жылля і дзіцячага садка) запраектавана размяшчэнне чатырох паркінгаў, разлічаных на 250 машынамесцаў кожны.

— Адзін паркінг ужо ў працэсе будаўніцтва, далей (па меры гатоўнасці жылля) будзем працягваць будаўніцтва астатніх паркінгаў, — сцвярджае Васіль Касавец.

Дарэчы, як адзначаў раней **генеральны дырэктар ДВА «Мінскбуд» Аляксандр ЦЕРАХАЎ**, прыярытэтным кірункам дзейнасці мінскіх будаўнікоў летась было ўзвядзенне жылля для тых, хто мае ў гэтым патрэбу, і будаўніцтва аб'ектаў рэспубліканскай і гарадской інвестпраграм. У сціслыя тэрміны завершана рэканструкцыя плошчы Перамогі, адкрыты новыя станцыі метро, уведзены ў эксплуатацыю сучасныя карпусы ўстаноў аховы здароўя, пабудаваны школы і дзіцячыя садкі.

**НАША ДАВЕДКА**

*Дзяржаўнае вытворчае аб'яднанне «Мінскбуд» з'яўляецца найбуйнейшай у краіне арганізацыяй па ўзвядзенні аб'ектаў жыллёвага і грамадзянскага будаўніцтва, у тым ліку жылля ў індустрыяльным выкананні.*

**Вольга АНУФРЫЕВА, фота аўтара.**

# СІМВАЛ ЖЫЦЦЯ НА НАШЫМ СТАЛЕ

## ЛІТАРЫ І ЛІЧБЫ

У савецкія часы курыныя яйкі не мелі «ўласных імёнаў» і адрозніваліся толькі назвай фабрыкі-вытворцы, на якую пакупнікі асабліва не звярталі ўвагі. Потым маркетолагі прыдумалі варыянты для розных катэгорый спажыўцоў — «Маладзецкія», «Лёгкія», «Знатныя» і г. д. Дарэчы, не варта верыць ідылічнай зялёнай траўцы на ўпакоўках і назвам накшталт «Фермерскія» і «Родам з вёскі». Супермаркеты (акрамя аддзелаў фермерскай прадукцыі) працуюць з буйнымі пастаўшчыкамі, якія могуць забяспечваць патрэбныя аб'ёмы прадукцыі, і нясушкі там не шпацыруюць свабодна па траўцы, вышукваючы чарвячкоў, а пражываюць сваё жыццё ў адпаведнасці з вытворчым цыклам. Так што мы адправімся па яйкі на Камароўку і на фермерскі рынак «Валяр'янава», які адкрыўся нядаўна — так бы мовіць, бліжэй да спрадвечнай сутнасці гэтага самага вясковага прадукту.

У крытым павільёне Камароўскага рынку пад продаж яек адведзена досыць шмат гандлёвых месцаў. Усе яйкі тут — беларускія (як і на іншых рынках, і ў гіпермаркетах). Гэта далікатны прадукт, які хутка псуецца, а галіна пакуль спраўляецца з попытам, так што везці яйкі аднекуль здалёк проста няма сэнсу.

— Яйкі, выробленыя на птушкафабрыках, звычайна маркіруюцца з дапамогай літары і лічбы, — распавядае прадавец. — Першая літара — гэта тэрмін захоўвання. Другая — лічба азначае катэгорыю яек па памеры.

Па тэрміне захоўвання яйкі дзеляцца на дыетычныя (у маркіроўцы літара Д) і сталовыя (літара С). Яйкі, пазначаныя літарай Д (такая маркіроўка часам наносіцца на шкарлупіну чырвоным колерам, але можа быць і сіняя, звычайна змяшчае таксама дату «знясення») — не нейкі адмысловы гатунак, а проста практычна толькі што знесенае яйка. Як той казаў, «з-пад курыцы». Тэрмін захоўвання дыетычных яек — не больш за сем сутак. Дарэчы, у гіпермаркетах рэалізоўваюцца ў асноўным яйкі катэгорыі С. На яйкі ва ўпакоўках маркіроўка можа не наносіцца: яна пазначана зверху. А па дыетычныя, сапраўды свежыя яйкі прыйдзецца ехаць на рынак. Тэрмін прыдатнасці сталовых яек — ад 25 дзён пры пакаёвай тэмпературы і да 90 дзён у халадзільніку.

— Піць сырымі сталовыя яйкі не варта, лепш варыць іх ці смажыць, — тлумачыць суразмоўніца. — А вось дыетычныя можна проста выпіць сырымі. З соллю. Некаторыя так любяць.

Што адбываецца з яйкам па меры яго ператварэння з дыетычнага ў сталовае? Пакуль яйка свежае, жаўток у ім нерухомы, а бялок шчыльны. Лічыцца, што вышыня прасторы, занятай паветрам, не павінна перавышаць 4 мм. Памятаеце недарэчную спрэчку паміж жыхарамі краіны Ліліпутаў і грамадзянамі імперыі Блефуску з «Падарожжа Гулівера» пра тое, з якога канца правільна разбіваць яйка — вострага або тупога? Дык вось, аказваецца, «тупаканечнікі» мелі рацыю: паветраная камера знаходзіцца якраз з тупога канца яечка, і чысціць вараное яйка, разбіваючы яго з гэтага боку, сапраўды лягчэй.

З часам бялок у яйку падсыхае, жаўток змяншаецца ў памеры і становіцца рухомы, а паветраная камера праз сем дзён павялічваецца да 7-9 мм.

— На рынку абавязкова глядзіце на дату вырабу, — раіць суразмоўніца. — Яйка з маркіроўкай «Д» можа па факце быць ужо сталовым.

НЕКАТОРЫ час таму ў Лунінцы каля раённай бібліятэкі быў усталяваны бюст пісьменніка работы скульптара Мікалая Кандрацьева. Назвалі ў раённым цэнтры і вуліцу імем Мікалая Калінковіча. Назвацьбы імем пісьменніка і Лунінецкую раённую бібліятэку!.. Землякі, жыхары горада старэйшага пакалення ведаюць, што краязнавец у свой час працаваў у раённай газеце. І некалькі месяцаў — да службы ў войску. І пасля заканчэння вучобы на факультэце журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. А яшчэ — думкі, меркаванні, падказкі Мікалая Мікалаевіча ўвасобіліся ў фарміраванні, арганізацыі экспазіцыі Лунінецкага раённага краязнаўчага музея. Пра гэта помняць у родным горадзе. І гэтая памяць, як мне падаецца, — неад'емная частка Асобы Калінковіча, працяг яго зямнога жыцця. У гонар пісьменніка ў 1990-я і пазнейшыя гады праводзіліся (і будуць праводзіцца!) чытанні, юбілейныя імпрэзы, дні памяці. Возьмем, напрыклад, толькі мінулы, 2020 год... Дарэчы, лічыцца (калі не па дакументах), што нарадзіўся Мікола 18 снежня 1950 года. Вось у «Год Калінковіча» адно за другім ладзіліся мерапрыемствы ў памяць пра земляка. 24 ліпеня — у 30-ы год з дня смерці пісьменніка — землякі па традыцыі сабраліся каля помніка. Прыйшлі сябры, сярод якіх — і браты Сяргей і Барыс Гнедзькі. Прыехалі пісьменнікі з Мінска — празаік і вучоны Сяргей Трахімёнак і паэтэса Іна Фралова. Пра свае сустрэчы з Калінковічам расказала педагог-ветэран Наталля Іванаўна Казанкова. Яна ў 1982—1986 гадах узначальвала раённы музей — і шмат кантактавала з Мікалаем. Выступіла на сустрэчы сённяшні музейны работнік Дзіна Грушэўская, распавёўшы пра тое, якія матэрыялы пра Калінковіча захоўваюцца ў скарбніцы памяці.

1 верасня ў гонар земляка — першы ўрок у мясцовым політэхнічным каледжы. І тэма зразумелая, краязнаўчая: «Я вырас тут, і край мне гэты дарагі». Віртуальную экскурсію па роднай старонцы правяла журналістка, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Тацццяна Канапацкая. Яна — і галоўны арганізатар усіх праектаў, звязаных з шанаваннем памяці пра Міколу Калінковіча. 22 верасня — сустрэча з вучнямі 11-га класа гімназіі Лунінца з нагоды 25-годдзя (выйшла ў 1995 годзе) выдання гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Лунінецкі раён». 5 снежня, 17 снежня — новыя сустрэчы, новыя размовы-дзеі пра краязнаўства, яго ролю ў патрыятычным выхаванні маладых людзей... Сапраўдны «Год Калінковіча»!.. Тацццяна Васілеўна Канапацкая вось што пра яго і ўвогуле пра памяць пра даследчыка Лунінеччыны гаворыць: «Так склалася, што, працуючы ў раённай газеце, займаючыся ў свой час падрыхтоўкай кнігі «Памяць. Лунінецкі раён», вывучаючы падзеі Вялікай Айчыннай вайны ў маім родным краі, я не магла абысці ўвагай вопыт такога яркага папярэдніка. Куды ні азірнешся — вобразна кажучы, на Лунінеччыне ці не ў любой тэме нябачна прысутнічае Мікола Калінковіч... Таму і многія гады землякі, самыя розныя, заўважу, землякі, прадстаўнікі розных прафесій, часам тыя людзі, якія зусім не ведалі яго пры жыцці, аб'яднаны ў захаванні памяці пра роднага і блізкага ўсім чалавека. І гэта дарагога варта!..»

**Мікола БЕРЛЕЖ.**


Мікола Калінковіч у родных мясцінах.

Ідэі і рашэнні

# Празрысты вігвам ці дрэва-гном?

## На алеі крэатыўных ёлак у Гродне вызначылі найлепшыя ідэі

**Не так даўно «Звязда» ўжо пісала аб тым, што ў гарадскім парку імя Жылібера стартаваў конкурс на самую арыгінальную ёлку, які быў разлічаны на калектывы прадпрыемстваў, ведамстваў і ўстаноў адукацыі. Дарэчы, гэтай прыгожай традыцыі ўжо некалькі гадоў, і з кожным годам ідэі ўвасаблення вобраза навагодняга дрэўца становяцца ўсё больш смелыя і нестандартныя.**

Сёлета, напрыклад, у конкурсе «ўзяло ўдзел» больш за сорак ёлак. Многія літаральна рабіліся па прынцыпе «я цябе зляпіла з таго, што было...» — гэткім чынам калектывы адлюстроўвалі і спецыфіку сваёй дзейнасці (у творчым працэсе выкарыстоўвалася ўсё: ад бляшанак-шклянак да металічных дыскаў).

Вызначыць пераможцаў дапамаглі інтэрнэт-апытанка, арганізаваная на сайце абласной газеты, і меркаванне прафесійнага журы.

Як растлумачыў **начальнік аддзела культуры Гродзенскага гарвыканкама Дзяніс ЧАРНЯК,** мэта конкурсу — зацікавіць калектывы арганізацый і прадпрыемстваў горада, а таксама ўсіх ахвотных гараджан магчымасцю рэалізаваць свой творчы патэнцыял. Як той казаў, не работай адзінай жывы чалавек, але і аб ёй забывацца не трэба: адной з умоў была перадача ў дызайнерскай задуме спецыфікі свайго прадпрыемства, арганізацыі, установы. Удзельнікі цікава падышлі да творчага працэсу: тут можна сустрэць нават святочны аўтобусны прыпынак, выкананы мясцовым аўтапаркам, і ёлку ў выглядзе жаночага ўбору ад швейнай фабрыкі «Элод».

Трэба сказаць, што знайшліся ў сеціве і крытыкі, якія палічылі прымітыўнымі некаторыя рашэнні. Між іншым, не трэба забывацца, што далёка не ўсе ўдзельнікі валодаюць вытанчаным мастацкім густам — гэта людзі працы, якія знайшлі нестандартныя рашэнні пры выкананні задання і зрабілі ўсё сваімі рукамі.

Дарэчы, пры вызначэнні пераможцаў і прызёраў арганізатары кіраваліся некалькімі крытэрыямі: адпаведнасць работы навагодняй тэматыцы, арыгінальнасць мастацкага дызайну, наяўнасць падсветкі і інфармацыі аб аўтарстве, трываласць канструкцыі і бяспечнасць замацаванай ёлкі, а таксама эстэтыка дрэўца.

Па выніках конкурсу найлепшай прызналі ёлку сярэдняй школы № 28 абласнога цэнтра. Яна нагадвае празрысты вігвам, напоўнены рознай навагодняй атрыбутыкай.

Не надта далёка ад пераможцы апынуліся і два сярэбраныя прызёры: шкляная ёлка ад РУП «Гроднаэнерга» і сані Дзеда Мароза ад ААТ «Белкард».

На трэцяй прыступцы ўмоўнага п'едэстала размясціліся адразу тры ўдзельнікі: «Гроднагаз» са сваёй блакітна-агністай фаеркай, СААТ «Дзіфа» з «дыскавай» ёлкай і РУП «Гродзенскае агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры» з пузатымі гномамі з яловых лапак.

Арганізатары сцвярджаюць, што наступным разам пачнуць размяркоўваць удзельнікаў па некалькіх катэгорыях — у залежнасці ад спецыфікі іх прафесійнай дзейнасці, таму што сёлета з-за колькасці работ вызначыцца з найлепшымі было вельмі няпроста.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Дамскія штучкі

# ЯК НАШЫ ПРОДКІ ЗБІРАЛІСЯ НА БАЛЬ?

## Размова з калекцыянерам Ігарам Сурмачэўскім

**Вось ужо колькі дзён мы адзначаем зімовыя святы. Па-сутнасці, рытуал святкавання не змяняўся дзесяцігоддзямі. Але як выглядалі ўрачыстасці нашых продкаў, якія жылі, скажам, у XVIII стагоддзі ці XIX?**

*У даследаванні Адама Мальдзіса «Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі» шмат сакавітага расказваецца пра пышныя балі, рэдуты беларускіх магнатаў, якія праводзіліся ў час «карнавалу» — ад Каляд да Вялікага посту. Напрыклад, на гродзенскіх балях «пілі з жаночых туфляў або з вялізных кулявак, пусты посуд білі аб падлогу або аб сваю ж галаву», моладзь гуляла ў фанты, «перапёлачку», «сляпую бабку». У лістах Марыі Святаполк-Мірскай апісваецца, як для балю 1914 года яна прыдумала сюрпрыз для гасцей: вялізны залаты арэх, у які схаваліся чатыры дамы. Калі арэх пад музыку ўрачыста раскрыўся пасярод залы, яны пачалі танцаваць менуэт.*

*Але самае яркае, вядома — гэта бальныя строі, якія марыць прымераць любая сучасная дзяўчына.*



**Тэрэза Корвін-Гасеўская (?-1708) у бальных строях з веерам-экранам, у суправаджэнні карліка. 1693 год.**

**Першы танец партнёры заўсёды танцавалі разам са сваімі нарачонымі. А калі кавалер пратанцаваў з дамай тры танцы запар, усё: трэба было рабіць прапанову рукі і сэрца.**

*Каб даведацца падрабязнасці, як жа нашы продкі збіраліся на баль, «Звязда» звярнулася да **рэстаўратара і калекцыянера Ігара СУРМАЧЭЎСКАГА:***

— Гаворка пойдзе аб тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. У Расіі была свая бальная спецыфіка: там усё пачалося ў эпоху Пятра I і называлася асамблеяй. А ў нас балі пайшлі з XVII стагоддзя — гэта час караля Яна Сабескага і яго жонкі Марысенькі. Марысенька нарадзілася ў Францыі, таму менавіта яна прыўнесла тую моду на землі Рэчы Паспалітай. Заходні, напрыклад, італьянскі ўплыў быў бачны і раней, дзякуючы польскай каралеве Боне Сфорца. Баль успрымаўся як урачыстасць, а для дам яшчэ і магчымасць выйсці ў свет. Вядома, што гэта суправаджалася доўгай падрыхтоўкай.

***— Натуральна, у першую чаргу гаворка ідзе аб адзенні?***

— Так, сукенкі замаўляліся ў Кракаве або Варшаве. Дамы спецыяльна наведвалі гэтыя гарады, каб трапіць на прымерку. Убранне шылася ў адзінкавым экзэмпляры. Калі сукенку неабходна было тэрмінова перашыць, то гэта рабілася ў Мінску або Вільні. А калі дама жадала здзівіць усё свецкае кола, то ехала па сукенку ў Вену, Парыж або Ніцу.

Колер іграў вялікую ролю. Напрыклад, калі дама надзявала васільковую сукенку, гэта казала аб тым, што яна не знаходзіцца ў пошуку. Ружовы або ліловы колер сведчыў кавалеру, што яму трэба падрыхтавацца да заляцанняў. Біжутэрыя таксама адыгрывала вялікую ролю. Напрыклад, чокер — упрыгажэнне, якое ўвайшло ў моду ў сярэдзіне XIX стагоддзя. У адной з англійскіх прынцэс быў шнар на шыі, і яна, жадаючы яго схаваць, ужыла такую стужку. Двор успрыняў гэта як нешта незвычайнае! Калі дама надзявала чокер з чорнай падшэўкай і белымі карункамі, гэта сведчыла аб тым, што яна не жадае весці ніякіх размоў з кавалерамі.

***— А што датычыцца дэталяў?***

— Увогуле, росквіт балю і мастацтва флірту выпадае на XVIII стагоддзе. Па-іншаму гэты век называюць «дамскім». Звярніце ўвагу, што ў гэты перыяд нават мужчынская мода была жаночападобнай. Гэта тлумачыцца тым, што менавіта ў той час дамы не толькі дыктавалі ўмовы моды, але і займалі высокія дзяржаўныя пасады. Неабходна было адпавядаць пэўным умовам. У першую чаргу гэта датычылася адзення. Шмат якія нюансы для сучаснага чалавека незразумелыя. Мне крыўдна, што ў нашых музеях пры гістарычнай рэканструкцыі многае не ўлічваецца, то-бок погляд на моду вельмі павярхоўны. У сваёй выстаўцы «Дамскія штучкі» я якраз хацеў звярнуць увагу на важныя дэталі, якія дапаўнялі ўвесь ансамбль жаночых строяў.

Гэта, у першую чаргу, шатлен — невялікая зацiскачка, якую дама надзявала на спецыяльны пояс, што знаходзіўся паміж спадніцай і карсажам. На гэтым шатлене знаходзіліся неабходныя рэчы, каб, напрыклад, хутка выправіць макіяж або што-небудзь зацыраваць. Зараз жанчыны носяць з сабой клатч, а ў той час сумачак не было.

Сёння сярод жанчын вельмі папулярны манікюр. Па сутнасці, ён стаў відам мастацтва. У той час манікюр таксама адыгрываў вялікую ролю. Лічылася, што пазногаць павінен нагадваць перламутравую ўнутранасць ракавіны. Для дасягнення такога эфекту жанчынам неабходна было ўвесь час паліраваць пазногаць, каб пласціна стала максімальна тонкай, і праз яе прасвечвалася скура. Пілачка, зробленая са сланавай косці, захоўвалася ў нэсэсэры — спецыяльным кантэйнеры, зробленым з дарагіх матэрыялаў: серабра, перламутру, чарапашынага панцыра.



**Набор дамскіх штучак: «пробнік для парфуму» (Багемія, XVIII стагоддзе); несэсер дамскі (Англія, XVIII стагоддзе); портбукет (Англія, XVIII стагоддзе); нажнічкі (Англія, 1820-я гады).**

У нэсэсэры быў нават маленькі сцізорык. Калі кавалер запрашаў даму да стала, а называлася гэта «падвесці даму пад руку», і яна частавалася тым жа яблыкам або апельсінам — то не магла проста пачаць есці садавіну. Трэба было акуратна зрэзаць скурку і падзяліць плод на часткі. Вось для чаго быў патрэбен сцізорык.



**Чокер пад назвай «не для інтымных адносін». Аксаміт, карункі. Францыя. Канец XIX стагоддзя.**



**Веер ріе «Гваздзікі». Косць, газ, роспіс. Францыя. Канец XIX стагоддзя.**

Значную ролю іграла парфума. Духі захоўваліся ў крыштальных флаконах па сто і нават дзвесце мілілітраў. Водар быў няўстойлівы, таму перад выхадам у свет дамам даводзілася моцна сябе «паліваць». У сярэдзіне XVIII стагоддзя самымі папулярнымі водарамі былі кветкавыя: лаванда, ружа, ландыш, бэз. Лічылася, што калі ты не пахнеш лавандай, то не належыш да вышэйшага кола. Цікавы факт: водар парфумы быў унісекс, яго ўжывалі і мужчыны, і жанчыны.

***— Вы казалі аб мастацтве флірту. Што ўваходзіла ў гэтае паняцце?***

— XVIII стагоддзе — гэта росквіт эпісталярнага жанру. Нельга было перадаць ліст пры ўсіх. Для гэтага існавалі спецыяльныя футаралы для любоўнай перапіскі. Па-англійску яны называліся «sweet note», то-бок салодкая цыдулка. Гэтыя футаралы былі выкананы з золата і служылі свайго роду маскіроўкай. Дама, схаваўшы любоўную цыдулку ў пазалочаны футарал, пакідала яго ў будуары, побач з люстэркам. І калі ў пакой заходзіў муж, ён не бачыў нічога падазронага.

Калі дама трапляла на баль, яна павінна была мець спецыяльную кніжачку — «карнэ дэ баль», куды занатоўваўся парадак танцаў. Насупраць назвы танца дама ўносіла імя кавалера, з якім будзе ў пары. Напрыклад, калі дама ўжо была запрошана на мазурку, кавалер мог запісацца на іншы танец. Лічылася дрэнным тонам у канцы свята дэманстраваць цалкам распісаны «карнэ дэ баль».

Першы танец партнёры заўсёды танцавалі разам са сваімі нарачонымі. А калі кавалер пратанцаваў з дамай тры танцы запар, усё: трэба было рабіць прапанову рукі і сэрца.

***— А якія асаблівасці правядзення баляў існавалі менавіта ў нас?***

— Звычайна балі праводзіліся ў гонар знакавых падзей. Самыя вядомыя — гэта, натуральна, калядныя балі, якія часам суправаджаліся забавай: паездкай на санях, якая мела назву «кулігі». Такое мерапрыемства было вельмі папулярнае на тэрыторыі Беларусі. У сваіх нататках баранеса Яніна Путкамер, пляменніца Ядвігі Любанскай, апісвае кулігі ў Вільні. Збіраўся цягнік з саней, які праязджаў па вуліцы, а яго пасажыры спявалі святочныя песні. Калі кулігі праходзілі за горадам, то «цягнік» курсіраваў ад маёнтка да маёнтка. У нататках Яніна апісвае і тое, што паны пераапраналіся ў цыганоў.

Сёння тыя, даўнейшыя балі, з усімі сваімі падрабязнасцямі засталіся толькі ў мемуарах ды хроніках... Але матэрыяльныя дэталі можна і сёння пабачыць на свае вочы ў музейных экспазіцыях і калекцыях, а дызайнерам і мадэльерам — натхніцца.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота з архіва Ігара СУРМАЧЭЎСКАГА.**




Даніна памяці

# КАНЦЭРТНЫЯ КАСЦЮМЫ І РУКАПІСЫ МУЛЯВІНА паказваюць музеі

**Сёлета Уладзіміру Мулявіну споўнілася б 80 гадоў. Да гэтай даты падрыхтаваныя тэле- і радыёперадачы, канцэрты, экспазіцыі, шматлікія публікацыі. Адкрыць цікавыя факты, папоўніць свае веды пра жыццё і творчасць Уладзіміра Георгіевіча можна, наведаўшы выстаўку ў Дзяржаўным музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, а таксама ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.**

Выстаўка ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры правядзе творчымі шляхамі славутага вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры». Тут прадстаўлены ўнікальныя экспанаты з фондаў музея, напрыклад, нотныя рукапісы Мулявіна, эскізы касцюмаў, зробленыя мастакамі Юрыем Піскуном і Вольгай Дзёмкінай, канцэртныя ўборы музыкантаў, магнітная стужка з ранім варыянтам сумеснай работы ансамбля з гуртом «The New Christy Minstrels».

Гэтая экспазіцыя зладжана ў супрацоўніцтве з музеем Уладзіміра Мулявіна ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Са збораў філарманічнага музея — некаторыя касцюмы артыста, яго аўтабіяграфія, буклеты і праграмы канцэртных выступленняў. Таксама наведвальнікі змогуць паглядзець відэазапісы з канцэртаў, пачуць галасы знакамітага калектыву.

У сценах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі вы пазнаёміцеся з нотамі, кампакт-дыскамі, грампласцінкамі, кнігамі і артыкуламі, якія раскрываюць жыццёвы і творчы шлях песняра. Яго гісторыя па-сапраўднаму ўнікальная, паколькі Уладзімір Георгіевіч, нарадзіўшыся далёка за межамі нашай краіны, па волі лёсу апынуўся ў Беларусі і не толькі палюбіў нашу зямлю, але і праславіў яе сваёй творчасцю.

З імем Мулявіна звязана адкрыццё новых кірункаў у беларускім эстрадным мастацтве. Дзякуючы яго бачанню і ўспрыманню паэзіі творы беларускіх класікаў — Янкі Купалы, Петруся Броўкі, Максіма Танка — атрымалі музычнае афармленне. Уладзімір Мулявін даў другое жыццё шэрагу народных песень, сярод якіх «Касіў Ясь канюшыну», «Купалінка», «Рэчанька» і іншыя — і іх пачулі далёка за межамі Беларусі.

Калі вы жадаеце пранікнуцца атмасферай творчасці вялікага артыста і аддаць даніну яго памяці, самы час наведаць гэтыя выстаўкі.

**Алена ДРАПКО.**

Апладысменты!

# АД «ЖАВАРАНКА» ДА «СОФ'І ГАЛЬШАНСКАЙ»:

## Музычны тэатр запрашае на юбілей

**Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр 17 студзеня адзначыць 50-годдзе творчай дзейнасці. Менавіта ў гэты дзень паўстагоддзя таму тут паказалі першы спектакль — гераічную музычную камедыю Юрыя Семяняскі «Пяе «Жаваранак». Да юбілею тэатрам падрыхтаваны святочны канцэрт, у якім нам пакажуць найлепшыя нумары, створаныя цяперашняй трупай. Прагучыць і аперэтачная класіка, і сучасны мюзікл.**

За мінулыя гады тэатрам былі пастаўлены сотні спектакляў самых розных жанраў. На яго сцэне выраслі пакаленні таленавітых салістаў, а сотні тысяч гледачоў апладзіравалі і захапляліся майстэрствам акцёраў, хору, балета і аркестра тэатра. Напрыклад, калі зазірнуць у рэпертуар першага сезона, то там прыхільнікам тэатральнага мастацтва прапаноўвалі для прагляду аперэты «Баядэра», «Халопка», «Вольны вецер», «Фіялка Манмартра», музычную камедыю «Каўказская палонніца». Сёння ў рэпертуары можна знайсці не толькі аперэты, але і мюзіклы, балет, музычна-драматычныя спектаклі, музычныя праграмы і музыкальнае рэвю, спектаклі для дзяцей і іншае.

Пагартаем разам старонкі гісторыі...

Тэатр быў створаны ў 1970 годзе і да 2000-га меў назву «Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі Рэспублікі Беларусь». Творчы лёс яго складваўся няпроста. Так, першыя дзесяць гадоў існавання калектыў не меў свайго памяшкання, таму са спектаклямі даводзілася вандраваць па розных сцэнічных пляцоўках сталіцы. І толькі 15 кастрычніка 1981 года адбылося адкрыццё новага, дванаццатага, сезона ў новым будынку па адрасе: Мяснікова, 44, дзе Музкамедыя знаходзіцца і дагэтуль. Тады тэатр паказваў аперэту Іагана Штрауса «Лятучая мыш». Дарэчы, спраектавалі будоўлю на месцы невялікага клуба камбіната тонкасуконнага валакна. Кіравалі будаўніцтвам вядомыя архітэктары Аксана Ткачук і Уладзімір Тарноўскі. Будынак, які і да сёння застаецца домам музычнага і тэатральнага мастацтва, з'яўляецца адной з выдатных пабудоў свайго часу. Як распавядала ў адным з інтэрв'ю Аксана Фёдараўна, у працэсе работы над будучым храмам тэатральнага мастацтва



было шмат цікавага і разам з тым складанага. Напрыклад, у «Мінскпраекце», дзе яна працавала, тады не было спецыялістаў па акустыцы, таму іх давялося шукаць у Ленінградзе. У архітэктуры тэатра прысутнічае шэраг адметных кампазіцый і дэталяў. Так, на фасадзе каля ўвахода вельмі заўважныя пяць алегарычных скульптур з кованай медзі, якія ўвасабляюць муз музычнага тэатра: паэзію, музыку, драму, выяўленчае мастацтва і танец. Каля тэатра таксама можна ўбачыць скульптурную кампазіцыю «Батлейка», выкананую па матывах беларускага народнага тэатра. Тут ёсць дзе пахадзіць і ў што паўглядацца.

Многія спектаклі, пастаўленыя ў гэтых сценах, сталі важнымі падзеямі ў культурным жыцці краіны і ўвайшлі ў залаты фонд нацыянальнай культуры. На сцэне музычнага тэатра атрымалі права першай пастаноўкі такія творы беларускіх аўтараў, як «Паўлінка», «Тыдзень вечнага кахання», «Сцяпан — вялікі пан» Юрыя Семяняскі, «Несцерка» і «Судная гадзіна» Рыгора Суруса, «Дзяніс Давыдаў» Андрэя Мдывані, «Джулія» і «Шклянка вады» Уладзіміра Кандрусевіча, «Вясновая песня» і «Прыгоды ў замку Алфавіт» Віктара Войціка, «Мільянерка» Яўгена Глебава. З пашырэннем жанравага рэпертуару павялічваўся і сам творчы калектыў. Сёння тут працуюць сапраўдныя майстры сваёй справы, выдатны сімфанічны аркестр, харавы калектыў і балетная трупа, пастановачна-тэхнічны састаў. Ладзяцца праграмы і з удзелам запрошаных творчых калектываў, салістаў, праводзяцца конкурсы, фестывалі, абменныя гастролі.

Калектыў тэатра і яго салісты неаднаразова былі адзначаны рознымі званнямі, станавіліся лаўрэатамі міжнародных і рэспубліканскіх творчых конкурсаў. Напрыклад, мюзікл Уладзіміра Кандрусевіча «Соф'я Гальшанская» (яго прэм'ера адбылася ў 2013 годзе) стаў на думку журы III Рэспубліканскага конкурсу тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія» найлепшай пастаноўкай сярод тэатраў музычнай накіраванасці. Яго рэжысёр-пастаноўшчык Міхаіл Кавальчык стаў тады лаўрэатам прэміі як найлепшы рэжысёр, а выканаўца ролі караля Ягайлы — саліст тэатра Антон Заянчкоўскі адзначаны як найлепшы акцёр спектакля музычнага тэатра. Уклад калектыву ў развіццё беларускай музычнай школы і беларускага музычнага мастацтва быў заўважаны, і ў 2000 годзе тэатру прысвоілі ганаровае званне «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь», а ў 2009-м — званне «Акадэмічны», пасля чаго ўстанову перайменавалі ў Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр.

Любяць і ведаюць калектыў і ў Мінску, і па ўсёй краіне, а таксама за яе межамі. Тут працуюць народныя артысты Беларусі Маргарыта Александровіч, Васіль Сердзюкоў, Веніямін Захараў, Антон Заянчкоўскі, Людміла Станевіч і многія іншыя таленавітыя прафесіяналы. Прыезд тэатра ў абласныя, раённыя цэнтры — гэта заўсёды сапраўднае свята для мясцовых жыхароў. Калектыў — жаданы госць і ў іншых краінах. У гастрольнай скарбонцы маюцца паездкі па краінах СНД і бліжняга замежжа.

Нават нягледзячы на пандэмію, якая ўнесла пэўныя карэктывы ў работу тэатра, тут працягваюць служыць тэатральнаму мастацтву. У снежні мінулага года публіку парадавалі прэм'ерай мюзікла «Рамэа vs Джульета. Праз XX гадоў», убачыць яго можна і ў студзені. А ў нядзелю тут чакаюць гледачоў, каб адсвяткаваць свае плённыя творчыя гады на сцэне. Добры настрой і вечар у цікавай кампаніі будзе найлепшым падарункам для ўсіх удзельнікаў імпрэзы.

**Алена ДРАПКО.**

Сыход

# Развітанне з колерам вайны

**Краіна развітваецца яшчэ з адной яркай асобай — народным мастаком Беларусі, удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны Леанідам Дзмітрыевічам ШЧАМЯЛЁВЫМ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Амаль два дзесяцігоддзі таму ў Мінску была заснавана дзяржаўная Гарадская галерэя твораў Леаніда Шчамялёва. У яе аснове — работы, якія мастак падарыў сталіцы. Дзякуючы і таму, што часта ў ёй можна было сустрэць самога Леаніда Дзмітрыевіча, дзякуючы руплівасці колішняга яе шматгадовага дырэктара мастацтвазнаўца Тацціяны Бембель, галерэя прыцягвала наведвальнікаў, вылучала нейкую асаблівую энергетыку шчырасці.

Народжаны ў лютым 1923 года, Леанід Шчамялёў і ў самым сталым узросце заставаўся актыўным, генератыўным творцам. А ўвогуле ў плынь, у вялікую раку выяўленчага мастацтва ён увайшоў яшчэ ў даваенны час. Атмасферу жывапісу ён пачаў спасцігаць у родным Віцебску, дзе, здавалася, сам горад ім дыхаў. Дзе ў 1920—1930-я гады колеры наваколля — Зямлі і Неба паядноўваліся з фарбамі і як быццам самі па сабе стваралі неўміручыя, прыцягальныя карціны...

Сярод пасляваенных настаўнікаў Леаніда Шчамялёва — легендарны Віталь Канстанцінавіч Цвірка. Вучань аддзячыў свайму настаўніку, намаляваўшы яго выразны, красамоўны партрэт, у якім усе пазнаюць і характар Віталя Цвіркі, і яго няўрымслівае жаданне служыць мастацтву, жывапісу шчыра, без аглядкі на час і абставіны. Так, на мой погляд, быў і Леанід Шчамялёў. Высокія пасады ў Саюзе мастакоў, высокія ўзнагароды — ордэны, медалі, прэміі, здаецца, не псавалі яго, не змякчалі цвёрды ўнутраны стрыжань, які сфарміраваўся ў канцы 1950-х — пачатку 1960-х гадоў, калі «адліга» нагадала ўсім творцам, што за мітуснёй і падлагоджваннем афіцыёзу можна страціць сябе, нагадала, што ў мастацтве застаецца толькі сапраўднае. Астатняе — хлусня, падробкі — усё гэта мінаецца, нават, здараецца, не вытрымлівае праверкі часу на дзесяцігоддзе-другое, знікае раней, чым сыходзіць з жыцця сам аўтар...

З сыходам Леаніда Шчамялёва можна сказаць і пра тое, што пайшло з жыцця ўсё пакаленне мастакоў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны... Пакаленне, якое было захавальнікам мастацкай памяці пра драматычныя і гераічныя падзеі.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Навінкі

# ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ ПРА КАРАТКЕВІЧА, КНІГА ПРА МАЗУРАВА, АЛЬБОМ РУШЧЫЦА

## Выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя» рыхтуецца да кніжнай выстаўкі

**«Гістарычныя асобы ў літаратуры. Кніжныя праекты ад выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», выдадзеныя ў 2020 годзе» — пад такой назвай адбылася сустрэча прадстаўнікоў выдавецтва з журналістамі. Падчас мерапрыемства абмеркавалі навінкі, што будуць прадстаўлены сёлета на XXVIII Мінскай кніжнай выстаўцы-кірмашы.**

— Калі ідзе размова пра гісторыю краіны, яе культуру, мы ўспамінаем тых людзей, дзякуючы якім гэтая гісторыя стваралася, — адзначае **дырэктар выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Вольга ВАНІНА.** — Сёння, адгукаючыся на запыты нашага чытача, мы выдаём шмат кніг, якія паказваюць жыццё, працу, дасягненні выдатных людзей Беларусі.

Асабліва папулярныя кнігі серый «Асветнікі Беларусі» і «Гісторыя для школьнікаў». У першай серыі прадстаўлены аповеды пра беларускіх духоўных лідараў розных эпох, а другая дае наглядную і грунтоўную інфармацыю пра гісторыю, дапоўненую ілюстрацыямі, архіўнымі фотаздымкамі, карцінамі мастакоў. За мінулы год у гэтых серыях з'явіліся кнігі пра Ірыну Паскевіч, Усяслава Чарадзея, Міхаіла Клеафаса Агінскага. Выдалі і некалькі персанальных энцыклапедый, прысвечаных Максіму Багдановічу, Францыску Скарыне і іншым знакавым дзеячам. Летась з'явілася энцыклапедыя пра Уладзіміра Караткевіча, чый юбілей мы нядаўна адзначылі. Яна змяшчае больш за сотню артыкулаў, якія дазваляюць бліжэй пазнаёміцца з жыццём і творчасцю класіка беларускай літаратуры, прасачыць уплыў асобы пісьменніка на розныя сферы мастацтва.

Апошнім часам выйшлі ў выдавецтве і дзве кнігі пісьменніцы Наталлі Голубевай — «Надзея Грэкава. Міхаіл Малінін. Час памятаць» і «Кірыл Мазураў. Пра што маўчаў час». Гэтыя выданні раскажуць шмат цікавага пра кіраўнікоў нашай краіны ў розныя перыяды. Кнігі заснаваны на шматлікіх архіўных дакументах, аўтар не пакінула без увагі пэўныя драматычныя жыццёвыя моманты, якія робяць герояў кніг і іх учынкі больш зразумелымі для сучаснай аўдыторыі.

— Я вельмі ўдзячная, што мы можам вяртацца да гісторыі XX стагоддзя, пераасэнсоўваючы яе ў ракурсе розных падзей. Сёння, думаю, наспела неабходнасць гаварыць пра той час. Ён быў неадназначны, драматычны, паспяховы, складаны ў розныя перыяды, але менавіта ён заклаў падмурак для развіцця нашай краіны, — адзначае **пісьменніца, кандыдат гістарычных навук Наталля ГОЛУБЕВА.** — Гэта было ўнікальнае стагоддзе ў плане стварэння, фарміравання новай палітычнай сістэмы, што дала вялікай колькасці людзей перспектывы для самарэалізацыі.

Што да таго, якія выданні змогуць убачыць і набыць наведвальнікі XXVIII Мінскай кніжнай выстаўкі-кірмашу, то тут будуць прадстаўлены кнігі трох кірункаў. Першы з іх звязаны з гістарычнай тэматыкай — папоўнілася серыя «Беларусь памятае: у імя жыцця і міру», у ёй выйшла кніга Івана Сацукевіча «Мінск: ад руін да росквіту», якая паказвае беларускую сталіцу з нечаканага ракурсу. На тэму мастацтва чытачам прапануюцца такія выданні, як «Акварэлія», «Зямля і неба Фердынанда Рушчыца» і іншыя. Трэці кірунак — кнігі, што раскрываюць тэму духоўнай культуры нашай краіны. Ён будзе прадстаўлены перш за ўсё такімі выданнямі, як «Жыровічы пад святым пакровам» і «Храм-помнік зямлі беларускай».

**Алена ДРАПКО.**

# «СТАЛІНСКІ ПРАСПЕКТ

## Як і чым жылі

**Пасля смерці Сталіна «жалезная заслона», якая аддзяляла Савецкі Саюз ад навакольнага свету, прыадчынілася. У БССР, як і ў іншыя савецкія рэспублікі, пачала прасочвацца разнастайная інфармацыя пра жыццё ў капіталістычных краінах. Гэтыя звесткі, якія мелі фрагментарны характар, усяляк скажаліся і дыскрэдытаваліся партыйнай прапагандысцкай машынай. Тым не менш, у часы «хрушчоўскай адлігі» вобраз Захаду ў масавай свядомасці жыхароў Савецкай Беларусі складваўся ўжо не толькі пад уплывам афіцыйных каналаў інфармацыі, але таксама і пад уздзеяннем замежнага кіно, кніг, часопісаў, заходніх радыёстанцый, а таксама непасрэдных кантактаў з замежнікамі на першых замежных выстаўках і ў турпаездках. Паволі жыхары БССР, перш за ўсё мінчукі, змянялі манеру мыслення і спосаб жыцця. Яны пераймалі ў Захаду каштоўнасці і штодзённыя практыкі, у тым ліку ў сферах спажывання, адпачынку, моды, паводзін.**

### Штаны-«дудачкі» і гальштук-«селядзец»

Найбольш адкрыта, дэманстратыўна да заходняй культуры апелявалі прадстаўнікі першай савецкай маладзёжнай субкультуры — стылягі, якія з'явілася ў канцы 1940-х у асяроддзі дзяцей тагачаснай маскоўскай эліты. Апагей папулярнасці стыляжніцтва прыпаў на 1950-я. Прыхільнікі субкультуры, не жадаючы быць падобнымі на сваіх бацькоў, спрабавалі вонкава пераймаць стыль паводзін і светапогляд амерыканскай моладзі (адсюль іх саманазва — «штатнікі»). Але праз абмежаванасць інфармацыі аб жыцці ў ЗША яны на самай справе стваралі ўласны свет, далёкі ад рэалій Амерыкі і Заходняй Еўропы.

Сацыяльнай базай стыляжніцтва было студэнцтва. Паводле Маі Абрамаўны Крывашэевай, якая ў першай палове 1950-х з'яўлялася намеснікам старшыні праўлення клуба БДУ, першымі беларускімі стылягамі былі студэнты ўніверсітэта, якія мелі сваякоў і сяброў у Маскве. З яе слоў, «таленавітыя хлопцы», якіх называлі яшчэ «касмапалітамі», з'явіліся пасрэднікамі пераносу з Масквы новай субкультуры, уключыўшы яе ў беларускі кантэкст.

Першых студэнтаў-стыляг, якія з'явіліся ў Мінску ў 1953 годзе, можна было пазнаць перш за ўсё па незвычайным тады адзенні — штанах-«дудачках», пінжаках у клетку з шырокімі плячыма і вузкім гальштукам-«селядцом». Запатрабаваныя ў іх былі світары з аленямі, якія насілі героі фільмаў «Серэнада Сонечнай даліны» і «Дзяўчына маёй мары». Улетку былі папулярныя яркія кашулі ў гавайскім стылі. У якасці абутку ў асяроддзі стыляг віталіся туфлі на тоўстай белай каўчукавай падэшве (так званая манная каша). Вылучала моднікаў у натоўпе і альтэрнатыўная прычоска. У той час як «афіцыйна прынятымі» мужчынскімі фрызурамі лічылі «бокс» і «паўбокс» з выгаленай патыліцай, стылягі адрошчвалі доўгія валасы «пад Тарзана», узбіваючы на галаве «кок». Вобраз дапаўнялі прадметы раскошы — трафейная запальніца ці рэдкая ў той час аўтаручка. У 1960 годзе сапраўднай славутасцю Мінска быў стыляга, які насіў завушніцу.

Афіцыйная прапаганда паказвала стыляг распешчанымі дзецьмі заможных, высокапастаўленых бацькоў. Гэта адпавядала рэчаіснасці толькі часткова і на першапачатковым этапе. Напрыклад, у 1956 годзе аб'ектамі крытыкі сталі лідары стыляг — студэнты Беларускага політэхнічнага інстытута: сын намесніка міністра ўнутраных спраў БССР Уладзімір Цімашэнка і сын адказнага работніка Дзяржплана БССР Алім Чарнышоў. Акрамя адзявання ў адпаведныя касцюмы, адрошчвання вусікаў і ўжывання блатнога жаргону ім ставілі ў віну захапленне «рэстараннымі, замежнымі мелодыямі». Аматарамі джаза былі таксама сын намесніка Добраахвотнага таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту па Мінскай вобласці Уладзімір Цітовіч



і сын дацэнта Беларускага лесатэхнічнага інстытута Леанід Пятруша. У лютым 1957 года яны былі заўважаны ў кампаніі «стыльна апранутага» кіяўляніна ў нумары гасцініцы Мінскага аэрапорта, прычым раніцай з іх нумара выйшла маладая жанчына.

Падобнае публічнае ганьбаванне стыляг, да таго ж з указаннем месца работы іх бацькоў, адгукалася ў значнай часткі беларускай моладзі, якая не магла дазволіць сабе весці падобны спосаб жыцця. Многіх абураў «стыль» не з прычыны яго нейкіх эстэтычных хібаў, а з-за адсутнасці магчымасці набыць моднае адзенне. Напрыклад, абурэнне паводзінамі стыляг студэнты Мазырскага педінстытута Міхаіл Цімошчанка і Мікалай Казачэнка растлумачылі так: «...бо многія жывуць толькі на стыпендыю і знаходзяцца на прыватных кватэрах, дзе няма нават прасаў».

### У Дзісне адбылася панажоўшчына пасля таго, як ленінградскі стыляга прапанаваў гарманісту выканаць свінгавы танец «лінда»

Сталічныя жыхары былі прыкладам для перыферыі, якая бачыла ў іх заканадаўцаў мод і густаў. Летам 1954 года аршанскі карэспандэнт газеты «Сталинская молодежь» паведамляў пра тое, як на танцпляцоўках горада «пад гукі сумнага танга дрыгаюць нагамі расфранчаныя стылягі». Тады ж жыхары г. Дзісна Мёрскага раёна насцярожана назіралі за незвычайнымі манерамі апранутага ў шырокі пінжак, «дудачкі» і лакавыя чаравікі васямнаццацігадовага ленінградца Эдуарда Вайніка, які прыехаў у госці да сваякоў. Гэта насцярожанасць перарасла ў бойку з панажоўшчынай — пасля таго як ленінградскі стыляга прапанаваў мясцоваму гарманісту выканаць свінгавы танец «лінда». Перанос новай субкультуры ў Маладзечна здзейсніла Алена Шкода, якая навучалася ў Львоўскім універсітэце. Да канца 1956 года стракатa апранутыя маладзёны прыцягвалі да сябе ўвагу мінакоў на вуліцах Гродна, Брэста, Гомеля, Полацка, Пінска і іншых беларускіх гарадоў.

Для дзяўчыны, каб быць залічанай у катэгорыю стыляг, было дастаткова ярка нафарбавацца і зрабіць прычоску «бабета», як у сэкс-сімвала Францыі Брыджыт Бардо ў фільме «Бабета ідзе на вайну». Асаблівым шыкам лічыліся вузкія, яркіх колераў спадніцы, якія шчыльна аблягалі сцёгны. У 1955 годзе, падчас адпачынку на Рыжскім узмор'і, першую ў сваім жыцці жанчыну-стылягу ўбачыла Эдзі Агняцвет. Ёю аказалася знаёмая паэткі — мінчанка Тоня К., «яшчэ зусім нядаўна сціплая жанчына з каштанавымі валасамі, укладзенымі на галаве вянцом». Вось як апісала Агняцвет метамарфозу, што адбылося са спадарыняй Тоняй: «На пышных валасах, ярка афарбаваных пірагідролам, замест шляпкі ўзвышаўся саламяны чаравік ядавіта-зялёнага колеру. Фіялетавая спадніца, карацей якой не прыдумаць, блакітны жакет і неймавернага фасону басаножкі, у руках вялізная бліскучая сумка і пальчаткі, хоць быў цёплы летні дзень».

Зборны вобраз стылягі вельмі ўмоўны. Існавала тонкая праслойка экіпіраванай па апошняй модзе «эліты» і асноўная маса пераймальнікаў, якія перашывалі і перакройвалі старыя замежныя альбо сучасныя рэчы савецкай вытворчасці. Напрыклад, віцебскія стылягі-саматужнікі, сярод якіх ужо сустракаліся маладыя рабочыя, куплялі ў краме дзіцячых тавараў рознакаляровыя шкарпэткі і расцягвалі адмысловым чынам да неабходнага памеру. У любым выпадку моднае адзенне выконвала ролю знака, які адрозніваў «сваіх» ад «чужых». Для людзей сталага веку гардэроб стыляг выглядаў дзікім спалучэннем фасонаў і колераў. Але ўнутры субкультуры ўсё было ўпарадкавана, для яе прадстаўнікоў нават дробныя дэталі мелі пэўнае значэнне.

Стыляжніцтва кідала выклік сталінскаму пурытанізму, уніфікацыі нораваў і густаў, што ўспрымалася значнай часткай грамадства варожа. Скандальнымі былі з'яўленні на вуліцах беларускіх гарадоў першых дзяўчат у штанах. Яны сутыкаліся не толькі з архаічнымі густамі, але і з мужчынскім шавінізмам. Усё гэта давялося адчуць на сабе выпускніцы Ленінградскага хіміка-тэхналагічнага інстытута Зоі Кузняцовай адразу па прыбыцці па размеркаванні на Магілёўскую фабрыку штучнага шоўку імя Куйбышава. Ужо на першым шпацыры па горадзе яе абразілі і асвісталі мясцовая шпана, пасля чаго Кузняцова была дастаўлена камсамольскім патрулём у штаб. Допыт маладога інжынера, які праводзілі маёр міліцыі Нагоркін і сакратар камсамольскай арганізацыі Магілёўскага педінстытута Дукель, таксама суправаджаўся абразамі («стыляжка») і рогатам («а што калі б я надзеў спадніцу?»). Праваліцца скрозь тратуар ад нахабных позіркаў мінакоў была гатовая мінская студэнтка Нэла Каўрыга, якая надзела штаны. А жыхарка г. п. Івацэвічы Ліванская за падобны «стыляжны ўчынак» зрабілася гераіняй сатырычнай насценгазеты.

### Мужчын у шортах не абслугоўвалі ў крамах, у сталовых, у цырульнях

Настроі апісваемага часу добра ілюструе стаўленне да такога элемента адзення, як шорты. Па распараджэнні мясцовых улад мужчын у шортах не абслугоўвалі ў крамах, у сталовых, у цырульнях. Убачыўшы на вуліцы чалавека ў шортах, міліцыя магла спыніць яго і запатрабаваць, каб парушальнік грамадскага спакою пераапрануўся. Працоўныя сцвярджалі, што падобнае адзенне абражае іх маральныя пачуцці. Адным з першых у Беларусі шорты ў спалучэнні з гавайскай кашуляй і сандалямі на босую нагу летам 1961 года апрануў работнік Мінскага радыёзавода Эрнст Пенс. Нягледзячы на рэгулярныя затрыманні міліцыяй і дружыннікамі, а таксама праборкі на камсамольскіх сходах, Пенс з'яўляўся на вуліцах сталіцы ў забароненым выглядзе зноў і зноў.

Модныя аксесуары накшталт сонцаахоўных акуляраў мадэлі «кацінае вока» выклікалі ў абаронцаў маральных асноў незадавальненне не меншае, чым моднае адзенне. Вось як карэспандэнт часопіса «Вожык» растлумачыў цалкам натуральнае жаданне беларускай дзяўчыны зрабіцца падобнай на галівудскіх зорак: «Яна цяпер у чорных акулярах, з завіўкай, у лакавых туфліках з абцасамі на цэлую пядзю.... Чорныя акуляры яна носіць не ад сонца — ёй сорамна глядзець людзям у вочы».

Насцярожана-варожае стаўленне грамадства да стыляг падагравалася прэсай, у тым ліку з дапамогай мастацкага слова. Дзіцячая пісьменніца Алена Філімонава-Кобец параўноўвала тых з мухаморамі, а «сапраўдную» савецкую моладзь — з баравікамі:

*Рос у лесе пад сасонкай*
*Мухамор на ножцы тонкай.*
*У чырвоным капялюшы*
*Ледзь насунутым на вушы.*
*З раскалмачанай чупрынай*
*Ды з бялюткай пелярынай.*
*І ўжо так ён ганарыўся,*
*Што й з грыбамі не вадзіўся.*
*(Хто тут роўны Мухамору!)*
*І, задраўшы нос угору,*
*Выхваляўся балбатун:*
*— Я разумнік! Прыгажун!*
*Хай крычаць, што я стыляга.*
*Не звяртаю я ўвагі.*

### «Рэзалі «дудачкі» і будзем рэзаць»

Да канца 1956 года стылягі, а дакладней, іх колькасць пачала сур'ёзна непакоіць камсамольскае кіраўніцтва рэспублікі. Адэпты новай субкультуры парушалі каноны прадпісаных сацыяльных паводзін, прапагандавалі ўласнымі паводзінамі і знешнім выглядам чужы спосаб жыцця. Таму з імі было вырашана змагацца, пакуль пераважна з дапамогай выхавання. З мэтай педагагічнага ўздзеяння на моладзь у газеце «Знамя юности» была распачата дыскусія «Размова пра густы, стыль і «стыляг». Тон дыскусіі задалі першыя надрукаваныя лісты чытачоў, дзе аматараў «кокаў», шырокіх пінжакоў і штаноў-»дудачак» прыраўнялі да дармаедаў, п'яніц і хуліганаў. Спроба групы студэнтаў на чале з Міхаілам Заборавым (братам славутага мастака) выступіць у абарону стыляг («яны ж савецкія людзі, якім проста падабаецца моднае адзенне, музыка, танцы») патанула ў хоры ахоўнай савецкай маралі. Іх агульную думку выказаў слесар кавальскага цэха МТЗ Валерый Купрыянаў: «Рэзалі «дудачкі» і будзем рэзаць... за ганебныя паводзіны і напышлівае стаўленне да навакольных».

З мэтай педагагічнага ўздзеяння ў 1956 г. у газеце «Знамя юности» з'явілася рубрыка «Як трэба адзявацца». Эпатажна апранутыя маладзёны зрабіліся пастаяннай тэмай карыкатурыстаў часопіса «Вожык». На пасяджэннях арганізаванага Мінскім гаркамам камсамола «Клуба дапытлівых» мадэльеры тлумачылі, што адзявацца трэба прыгожа, з густам і сціпла. Лекцыя «Паразмаўляем пра густы» з наступнай дэманстрацыяй «правільнага» адзення стала абавязковым пунктам плана работы райкамаў ЛКСМБ.

Неўзабаве «рабы ануч» зрабіліся прадметам абмеркавання на вышэйшым камсамольскім форуме рэспублікі. Выступаючы ў студзені 1962 г. на XXII з'ездзе ЛКСМБ, рэдактар «Знамени юности» Аляксандр Зінін, у прыватнасці, адзначыў: «Таварышы, мне здаецца, што мы недаацэньваем шкоду, якую наносяць нам так званыя стылягі, вельмі паблажліва адносімся да іх далёка не бяскрыўдных дзівацтваў. Гэтая «залатая» моладзь не толькі псуе моду, яна нізкапаклонніцае перад іншаземцамі, ганьбіць гордае імя савецкага чалавека». У канцы свайго выступлення Зінін прапанаваў адпраўляць тых, хто прагне «прыгожага жыцця», у штанах-«дудачках» вазіць торф ці будаваць дарогі. Яго падтрымаў сакратар камітэта камсамола Беларускага радыёкамітэта Генадзь Бураўкін, які выказаўся супраць тых маладых пісьменікаў, якія «...праяўляюць хваравітую цікавасць да расчараваных дзімкаў, якія валяюцца на пляжах у «звышмодных» плаўках».

З «расчараванымі дзімкамі» імкнуліся змагацца таксама з дапамогай адміністрацыйных мер. На сты-

Карыкатура «Вожык. 1958.



# МЫ НАЗЫВАЛІ БРАДВЕЕМ»

## беларускія стылягі

ляг ладзіліся аблавы. Спачатку актывісты іх выводзілі з вечарын і танцпляцовак. Але паколькі стыляжніцтва не згасала, а наадварот — пашыралася, з ім пачалі змагацца больш жорстка. Брыгадмілы (грамадскія памочнікі міліцыі) распорвалі празмерна вузкія штаны, зрывалі стракатыя гальштукі, стрыглі валасы. За стыляжніцтва таксама маглі выключыць з камсамола і з навучальнай установы.

Ад усіх гэтых выхаваўча-рэпрэсіўных мер было мала карысці. Ва ўмовах незадаволеных інтэлектуальна-эстэтычных патрэбнасцяў цэлага пакалення яны толькі распальвалі інтарэс да «забароненага плоду». У маладзёжным асяроддзі стала прэстыжна быць моднымі. Многія маладыя людзі трацілі значную частку свайго вольнага часу і грошай на пошук стыльнага замежнага адзення, любымі спосабамі «даставалі» яго, у тым ліку з дапамогай фарцоўшчыкаў. Гэта былі праявы новай масавай сацыяльнай з'явы.

### «Сустракаюцца пары, якія не танцуюць, а канвульсіўна паторгваюць нагамі, рукамі, усім целам пад гукі «бугі-вугі»

Акрамя адзення, важнай прыкметай стылягі былі яго музычна-танцавальныя прыхільнасці. Прасунутая моладзь Беларусі другой паловы 1950-х слухала замежную, перш за ўсё амерыканскую, джазавую музыку. Яе кумірамі былі свінгавыя аркестры Дзюка Элінгтана і Бэні Гудмена. Пасля паказу на беларускіх экранах карціны «Серэнада Сонечнай даліны» культавай сярод стыляг стала песня «Цягнік на Чатанугу» (альбо проста «Чу-ча») з рэпертуару аркестра Глена Мілера. Да пачатку 1960-х гг. заходняя мода змянілася — замест свінгавых аркестраў прыйшлі выканаўцы рок-н-рольных кампазіцый Элвіс Прэслі, Чак Бэры і Літл Рычард.

Менавіта ад стыляг пайшла традыцыя падпольнага гуказапісу, якая атрымала ў народзе назву «музыкі на костках», «музыкі на рэбрах» або «шкілет маёй бабулі». Падобныя пласцінкі нелегальна наразалі на рэнтгенаўскіх здымках работнікі адкрытага ў 1955 года на прамкамбінаце Сталінскага раёна Мінска першага ў Беларусі цэха па вытворчасці грампласцінак. Якасць запісаў была, як правіла, жудасная, а каштавалі яны значна даражэй, чым легальная прадукцыя камбіната. Тым не менш, попыт на іх захоўваўся да канца 1950-х — пачатку 1960-х гг., калі магнітафоны зрабіліся часткай штодзённага жыцця савецкіх людзей.

Дзякуючы стылягам вялікую папулярнасць на танцпляцоўках БССР атрымалі такія танцы, як «бугі-вугі», затым «рок-н-рол» і «твіст». У Мінску іх выконвалі, «каб рабіць касу» на верандах у парку імя Горкага, парку імя Чалюскінцаў, Палацы культуры прафсаюзаў. Сучасніца так апісвае звычайны вечар 1957 года на танцпляцоўцы ў парку імя Горкага: «Што там робіцца! Гэта ж не танцы, а таўкучка. Сустракаюцца пары, якія не танцуюць, а канвульсіўна паторгваюць нагамі, рукамі, усім целам... пад гукі «бугі-вугі». Акрамя энергічных «бугі» і «рока», вестэрнізаваная моладзь дэманстравала асаблівы стыль павольных танцаў, што таксама выклікала незадаволенасць музычных патрулеў: «На верандах, у парках і клубах... юнакі і дзяўчаты, прытуліўшыся ўшчыльную адно да аднаго, ледзь перастаўляюць ногі, не звяртаючы ніякай увагі на музыку. Ім усё роўна, што іграе аркестр — вальс, танга, факстрот або польку. Дружыннікі, заўважыўшы такую пару, звычайна папярэджваюць яе, а то і проста выводзяць». У 1963 годзе нечакана для ахоўнікаў сацыялістычнай маралі мінскія танцпляцоўкі накрыла хваля твіста, які выглядаў як «расціранне на падлозе падэшвамі неіснуючых недакуркаў».

### Прыхільнікаў твіста чакалі шматлікія пераломы костак і разрывы звязак

Не саступалі ў танцавальна-музычных інавацыях мінчанам іх аднагодкі ў абласных гарадах. Напрыклад, у Гомелі стыльная моладзь перыядычна рабіла налёты на танцпляцоўку Парку культуры і адпачынку імя Луначарскага. Сучаснік так апісвае адзін з падобных налётаў, здзейснены ў 1960 годзе: «У імклівым вальсе кружацца пары, льюцца чароўныя гукі — пявучыя і меладычныя. І раптам замест гэтай музыкі з дынаміка вылятаюць нейкія віскі, рэжуць слых. Невялікая група танцуючых пачынае выгінацца, тузацца. Глядзіш на іх і думаеш: — Ці не параліч разбіў гора-танцораў?». Адміністрацыя Віцебскага парку культуры і адпачынку імя Фрунзэ выводзіла з танцпляцоўкі стыляг з віхлястай хадой, не ўступаючы ў дыскусію.

Карыкатура «Вожык». 1958.




Тагачасная прэса не шкадавала эпітэтаў для дыскрэдытацыі модных танцаў — іх называлі «непрыстойнымі крыўляннямі», «скокамі дзікуноў», «сутаргамі сектантаў». Для ўзмацнення выхаваўчага эфекту захапленне моднымі заходнімі танцамі звязвалася з п'янствам, амаральнымі і хуліганскімі ўчынкамі. У 1956 годзе героямі аднаго з падобных выхаваўчых артыкулаў зрабіўся аматар стыльных танцаў 18-гадовы слесар прадпрыемства «Вадаканал» Мікалай, які «...збіў культмасавіка парку імя Чалюскінцаў» пасля таго, як той выклікаў на яго і яго партнёршу міліцыю. Студэнты Пінскага хіміка-тэхналагічнага тэхнікума заўважылі, што іх аднакурснікі — аматары стыльных танцаў «...адасобіліся, пачалі жыць уласным міркам, дрэнна вучыцца». Па словах начальніка палітупраўлення Беларускай вайсковай акругі генерал-лейтэнанта Начынкіна, праходзячы ў 1959 годзе тэрміновую службу ў в/ч 11793, «стыляга № 1 горада Баку» Анатоль Раеўскі «...спрабуючы культываваць амерыканскія і заходнееўрапейскія танцы, выказваў хваравітыя, не ўласцівыя савецкай моладзі погляды на жыццё».

Калі «рок-н-рол» афіцыйна ганьбіўся як танец «эратычны, вульгарны паводле ўласнай прыроды, які прыніжае жаночую годнасць», то прыхільнікаў твіста чакалі «шматлікія пераломы костак, разрывы звязак і іншыя цяжкія калецтвы». З мэтай змагання з «прыніжаючымі годнасць чалавека» «рок-н-роламі» і твістам у 1963 годзе рэдакцыя перадач для дзяцей і юнацтва Мінскай студыі тэлебачання распачала цыкл перадач пад назвай «Запрашэнне на танец». Яны знаёмілі з новымі танцамі сацыялістычных краін: усходненямецкім «ліпсі», кубінскім «дружба» і іншымі. У наступным годзе ў Віцебску адкрыўся гарадскі клуб аматараў музыкі, дзе чыталіся лекцыі і праводзіліся размовы аб класічнай і тагачаснай савецкай эстраднай музыцы.

Аднак, нягледзячы на ўсе намаганні ідэолагаў, даць рады ўсюды пранікаючай заходняй музычнай культуры не атрымлівалася. Краязнавец і публіцыст Віктар Саяпін так апісваў тагачасную маладзёжную танцавальную культуру Гродна: «Другая палова 1950-х і амаль уся першая палова 1960-х прайшлі пад знакам джаза і рок-н-рола. Пад радыёлу і рэдкія тады заходнія грампласцінкі на хатніх вечарынках танцавалі бугі-вугі, чарльстон, твіст, а потым і шэйк... Цэнтрам прыцягнення моладзі Гродна ў летні час была танцпляцоўка ў гарадскім парку — «клетка».

Не меншую, чым танцоры, занепакоенасць ідэолагаў выклікалі джазмены накшталт музыкантаў, сабраных у эстрадны аркестр Беларускага політэхнічнага інстытута Львом Молерам. Пачынаючы з 1956 года аркестр крытыкавалі за выкананне заходняга джазавага рэпертуару, свабодныя імправізацыі і падкрэслена незалежныя паводзіны кіраўніка. Праз два гады афіцыйная крытыка казала ўжо пра «шматлікія джаз-аркестры і музычныя ансамблі, якія прапагандуюць нізкапробныя «шэдэўры» з арсенала заходнееўрапейскіх і амерыканскіх джазаў». А ў 1962 годзе ў выкарыстанні элементаў рок-н-рола і бугі-вугі быў абвінавачаны эстрадны аркестр Беларускага радыё і тэлебачання, дзе ў асноўным працавалі маладыя творцы.

### «Быў Іван, цяпер ён Жан, мінскі цень ён парыжан»

Стылягі мелі адмысловыя манеры паводзін — закінутая назад галава, пагардлівы погляд зверху ўніз, асаблівая расхістаная хада, насвістванне джазавых мелодый сведчылі аб прыналежнасці да багемы. У апісанні карэспандэнта «Чырвонай змены» гэтая манернасць даведзена да карыкатуры: «рухаецца, віхляючыся ўсім корпусам — не ідзе, а піша, або гарцуе гэткім жарэбчыкам, ...у гутарцы падкрэслена ветлівы, з пэўным наборам мудрагелістых слоў і выразаў, ...аддае перавагу яздзе ў аўтамашыне (вядома, у персанальнай бацькавай), ...заўсёды гатовыя закахацца раз і назаўсёды».

Тым не менш, не варта лічыць стыляг прадвеснікамі сексуальнай рэвалюцыі. Называлася, хутчэй, пэўнае аслабленне пурытанскай маралі сталінскага часу, калі абдымкі і пацалункі ў грамадскіх месцах разглядаліся ў якасці адміністрацыйнага злачынства. Студэнткі адкрыта курылі, не шкадавалі касметычных сродкаў, з'яўляліся на вечарынках у адкрытых сукенках. Аднак, паводле слоў знакамітага расійскага акцёра Алега Янкоўскага, які ў канцы 1950-х вучыўся ў старэйшых класах СШ № 4 г. Мінска, «...у цане былі чысціня і ўнутраны агонь».

Стылягі мелі адмысловую мову, слэнг. Словы перарабляліся на амерыканскі капыл (бацька — фазер, глядзець — лукаць, выпіваць — дрынкаць, штаны — траўзеры, шкарпэткі — соксы, чаравікі — шузы, прайсціся — кінуць брэк), а таксама выкарыстоўваліся запазычаныя ў джазменаў жаргонізмы кшталту «чувак», «хата», «жалезна» і іншыя. Славянскія імёны падпадалі пад уплыў вестэрнізацыі: Міхаіл пертвараўся ў Майкла, Фёдар — у Фрэда, Рыгор — у Гары. Сярод іншых гэта заўважыў паэт Аляксей Зарыцкі:

*Быў Іван,*
*Цяпер ён Жан,*
*Мінскі цень ён парыжан.*
*На Палессе вёрст за трыста*
*Я заехаў,*
*Справа горш:*
*Сустракаю трактарыста,*
*Падае руку ён:*
*— Жорж.*

У пачатку 1960-х асаблівым шыкам для мінскіх стыляг было мець пры сабе кішэнны радыёпрыёмнік, настроены на рок-н-рольную хвалю. Ахвярамі гэтай моды стала больш за тысячу трубак, зрэзаных на працягу 1960-га і трох месяцаў 1961-га ў сталічных тэлефонах-аўтаматах. Іх мікрафоны выкарыстоўваліся радыёаматарамі для вырабу мініяцюрных радыёпрыёмнікаў.

### «Па адным баку толькі стылягі і хадзілі, а людзі пераходзілі на іншы бок»

У Мінску і некаторых абласных цэнтрах існавалі месцы збору стыляг, што мелі назву «Брадвей» (ці скарочана — «Брод»). На іх маладзёны маглі прадэманстраваць уласную непаўторнасць, раскрыць індывідуальнасць, вылучыцца з натоўпу, шэрай масы. «Кінуць брэк па Броду» ў Мінску азначала шпацыр па праспекце Сталіна (з 1961 года — Ленінскім) ад паштамта да Круглай плошчы. У Гродне «Брод» знаходзіўся на вуліцы Савецкай. У Віцебску ён быў лакалізаваны ў раёне прыватнага сектара Пескаваткі, каля кафэ «Маладзёжнае» і Парку культуры і адпачынку імя Леніна.

Рэгулярным наведвальнікам сталічнага «Брадвея» быў Алег Янкоўскі. У адным з апошніх інтэрв'ю, дадзеных пасля здымак у фільме Тадароўскага «Стылягі», ён нечакана згадаў сваё мінскае юнацтва: «Наваралі падэшвы на чаравікі, я ўжо не памятаю як. Ушывалі штаны, пінжакі клятчастыя куплялі на некалькі памераў большыя, каб шырокія плечы былі. І «кокі» на галаве. У некаторых нават нейкая філасофія была. Зразумела, музыка, рок-н-рол, бугі, запісы на рэнтгенаўскай плёнцы. І самае галоўнае — бадзянне па Брадвеі, так у кожным горадзе, у тым ліку і ў Мінску, цэнтральную вуліцу называлі. Курылі вальяжна, каб падавацца дарослымі і буржуазнымі... Кампанія жыла адным духам. Знаёміліся на гэтым Брадвеі. Па адным баку толькі стылягі і хадзілі. А людзі нейк цураліся іх, пераходзілі на іншы бок».

У мастака-мультыплікатара, сцэнарыста і рэжысёра Алега Белавусава на ўсё жыццё засталася ў памяці атмасфера свята, карнавалу на мінскім «Бродзе» пачатку 1960-х: «Прайсці па праспекце бывала даволі цяжка... Здавалася, увесь падлеткавы Мінск збіраўся тут, шпацыравал туды-сюды штодня, без стомы. Тут сустракаліся, тут знаёміліся, тут біліся, тут улюбляліся... Усе, здавалася, былі знаёмыя з усімі, усе адно аднаго ведалі, збіраліся натоўпамі, стаялі гоман, рогат... Натоўпы распадаліся, каб утварыцца зноў, у іншым складзе, у іншым месцы...».

Стыляжніцтва гэтак жа раптоўна скончылася, як і пачалося. У сярэдзіне 1960-х гг. «стыль» стаў ахвярай дэмакратычнай джынсавай моды барадатых, апранутых у світары «пад Хемінгуэя» і берэты бітнікаў, а неўзабаве — хіпі. Першая хваля эпатажнага маладзёжнага руху сціхшылася.

Субкультура стыляг стала своеасаблівым стыхійным пратэстам супраць падпарадкаванасці асабістага калектыўнаму, бальшавіцкага аскетызму, афіцыйнай ідэалогіі ў цэлым. Яскравыя, часам недарэчныя ўборы вылучалі стыляг з натоўпу працоўных і сведчылі пра з'яўленне пазасістэмнай апазіцыі на ўзроўні штодзённай культуры. Шакавальныя кашулі і сукенкі казалі аб нязгодзе маладых людзей з савецкімі каштоўнасцямі і аб марах пра вольнае, вясёлае і бесклапотнае «заходняе жыццё».

Знешне стыляжніцтва было дэпалітызавана і не мела дачынення да тагачасных падпольных нанканфармісцкіх гуртоў, у якіх брала ўдзел асобныя прадстаўнікі гуманітарнай інтэлігенцыі, мастакі, студэнты. Аднак побытавы нанканфармізм, параўнанне савецкіх і заходніх жыццёвых стандартаў непазбежна аслаблялі веру ў камуністычныя ідэалы. Некаторых стыляг вызваленне ад бальшавіцкай міфалогіі ўжо ў пачатку 1960-х гг. падводзіла да пошукаў сацыяльных і палітычных альтэрнатыў. Неўзабаве пасля арышту ў 1962 годзе лідара мінскага андэграўнду Кіма Хадзеева газета «Советская Белоруссия» пісала: «Гады два таму нейкі Хадзееў здолеў арганізаваць у Мінску групу «стыльнай» моладзі, у якой прапаведаваў дух упадніцтва, песімізму і антыпатрыятычныя нігілізму. Вядома ж, такі ўплыў — непасрэдная падрыхтоўка да здрады Радзіме».

Такім чынам, у працэсе сутыкнення субкультуры стыляг з савецкай машынай таталітарнай уніфікацыі і кантролю яна набывала выразныя рысы контркультуры. Яе прадстаўнікі пераходзілі ад вонкавага перайімання амерыканскага спосабу жыцця да актыўнага сацыяльнага, а ў шэрагу выпадкаў — палітычнага пратэсту. Так субкультура стыляг набывала рысы дысідэнцтва.

**Аляксандр ГУЖАЛОЎСКІ,**
**доктар гістарычных навук.**

Пераадоленне

## Сяргей ГРЫБАНАЎ:

# «СПОРТ ДАЗВАЛЯЕ ЛЮДЗЯМ З ІНВАЛІДНАСЦЮ РЭАЛІЗАВАЦЬ СЯБЕ»

**Калі падбіраць метафару да прафесійнай кар'еры Сяргея Грыбанава, самай трапнай будзе — узыходжанне на гару. А шлях туды, як вядома, лёгкі не бывае. Так і ў яго — розныя гарады, розныя прафесіі і жыццёвыя абставіны. Але заўсёды — гарачая любоў да спорту і жаданне праявіць сябе. Нарэшце — дайшоў, сабраў калекцыю медалёў з чэмпіянатаў свету і Еўропы, Параалімпійскіх гульняў і не спыніўся. Зараз Сяргей Грыбанаў працуе з параалімпійцамі як трэнер, фізіятэрапеўт і масажыст. Як гэта магчыма — ён расказаў «Звяздзе».**



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

***— Сяргей Міхайлавіч, адкуль у вас такая любоў да спорту?***

— Мой бацька — майстар спорту па самба. Ён ваенны, актыўна займаўся ваенна-прыкладнымі відамі спорту. І тата заўжды быў ці чэмпіёнам, ці прызёрам акругі. Мама каталася на лыжах, нават удзельнічала ў спаборніцтвах. Мабыць, любоў да спорту перадалася мне праз бацькоўскія гены. Але ў дзяцінстве мяне не бралі ў спартыўныя секцыі праз парушэнні зроку. Я быў вызвалены ад фізкультуры ў школе, але нелегальна хадзіў у спартыўны зал у ваеннай часці, дзе служыў тата. Мы тады яшчэ ў Літве жылі. Пасля — працаваў слесарам на прадпрыемстве, там быў выдатны спартыўны комплекс з басейнам, трэнажорный залай, лазняй і нават боўлінгам. Для невялікага горада Шаўляй у савецкі час гэта было ў навіну. А ў 1993 годзе наша сям'я пераехала ў Дзяржынск, і там я таксама пайшоў у трэнажорную залу. Але спорт — гэта не толькі трэніроўкі, гэта ж спаборніцтвы і падрыхтоўка да іх, што і адрознівае спорт ад фізкультуры.

> **«Сёння, калі так востра стаіць праблема допінгу і калі забаронены нават некаторыя вітаміны, роля немедыкаментозных метадаў у падрыхтоўцы спартсменаў значна ўзрастае».**

***— І калі ў вашым жыцці пачаліся сістэматычныя заняткі спортам?***

— У 1995 годзе я паступіў у Гродзенскае медыцынскае вучылішча, і там мяне сталі прыцягваць да спаборніцтваў, я добра пазнаёміўся з лёгкай атлетыкай. А ўжо ў 1996 годзе выйграў чэмпіянат краіны ў кіданні дыска. Потым былі розныя жыццёвыя моманты. Пасля вучылішча працаваў у сельскай бальніцы, і не заўсёды атрымлівалася трэніравацца з-за шасцідзённага працоўнага тыдня. Потым перайшоў на паўстаўкі і адзін дзень працаваў у бальніцы, адзін дзень — трэніраваўся. Сям'я мне, канешне, дзякуй не сказала, але так было трэба. Мая спартыўная кар'ера склалася дзякуючы трэнеру Аляксандру Інакенцевічу Літвіненку. Ён дапамог мне ўладкавацца на работу ў Мінск, і я, нарэшце, змог сумяшчаць работу і трэніроўкі. З 1999 года ў нас пачалося нармальнае ўзаемадзеянне спартсмена і трэнера, бо займацца спортам «набегамі» не вельмі эфектыўна.

***— Прабачце за нясціплае пытанне, але колькі вам было гадоў, калі вы пачалі кар'еру спартсмена?***

— У 1999 годзе мне было 27 гадоў і да 36 гадоў мае вынікі толькі раслі. У 36 гадоў я ўстанавіў свае асабістыя рэкорды, і толькі потым пачаўся спад. У першы год прафесійнай кар'еры, у 2000 годзе, я выканаў нарматыў на майстра спорту. А ў 2001-м заваяваў два медалі на сваім першым міжнародным старце, на чэмпіянаце Еўропы па лёгкай атлетыцы. У 2002-м заваяваў ліцэнзію на Параалімпійскія гульні 2004 года, дзе стаў бронзавым прызёрам у кіданні дыска. І кожны год быў на п'едэстале ці побач з ім, але ўсё ніяк не атрымлівалася перамагчы. На Параалімпійскіх гульнях 2008 года ў Пекіне заняў толькі чацвёртае месца. Мог бы ўзяць медаль, але перашкодзілі пэўныя арганізацыйныя моманты.

***— Якія?***

— На Параалімпіядзе ў Пекіне былі аб'яднаны татальна сляпыя спартсмены і мы, атлеты з рэштковым зрокам. І ў татальна сляпых быў моцны гандыкап (спосаб ураўнівання магчымасцяў слабых удзельнікаў спаборніцтваў з больш моцнымі праз прадстаўленне ім пэўнай перавагі. — **прым.** «Звязды»). І каб выйграць у татальна сляпога, трэба было выступіць як здаровы алімпіец. З гандыкапамі заўжды ўзнікала шмат цяжкасцяў, гэтае пытанне пастаянна абмяркоўвалі. Таму што цяжка справядліва ацэньваць выступленні. І цяпер на Параалімпійскіх гульнях раздзяляюць спартсменаў з рэштковым зрокам і татальна сляпых.

***— Для пачатку спартыўнай кар'еры ваш узрост быў дастаткова салідны. Цяпер як трэнер вы ўзяліся б за «сталага спартсмена»?***

— Я лічу, што лепей позна пачаць займацца спортам, чым ніколі. Я паўнавартасна працую трэнерам з 2013 года, і ў мяне няводнага спартсмена, маладзейшага за 30 гадоў. Калі чалавек схільны да пэўнай дзейнасці, то пачынаць можна ў любым узросце. Работа з параалімпійцамі — гэта не толькі непасрэдна трэніровачны працэс, але яшчэ і шэраг арганізацыйных момантаў, за якія адказвае трэнер.

***— Сваёй кар'ерай спартсмена вы задаволены?***

— Так, улічваючы, што я ніколі не лічыў сябе вельмі спартыўна адораным чалавекам. У майго трэнера Аляксандра Літвіненкі было два кідальнікі — я і Юра Бучкоў, мы былі своеасаблівымі канкурэнтамі. І трэніраваліся мы аднолькава інтэнсіўна, але Юра быў на крок наперадзе. З цягам часу я яго абагнаў. Спорт даў мне магчымасць паступіць у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры. Проста так чалавека з парушэннямі зроку ніхто б не ўзяў, а параалімпійца — калі ласка. Падчас паступлення быў цікавы эпізод. Камісія глядзіць атэстат, дзе няма адзнакі па фізкультуры, па статуце ўніверсітэта залічыць такога абітурыента немагчыма. А побач — пасведчанне майстра спорту міжнароднага класа, і як яго не ўзяць. Сапраўды, навошта майстру спорту фізкультура? Спорт дазваляе людзям з інваліднасцю атрымаць адукацыю, зарабляць грошы, паглядзець свет, дзякуючы выездам на спаборніцтвы.

***— Як так атрымалася, што вы сумяшчалі свае спартыўныя выступленні, работу трэнера і масажыста?***

— Яшчэ падчас сваёй спартыўнай дзейнасці я на грамадскіх пачатках дапамагаў калегам як масажыст, бо меў пэўныя веды. Афіцыйна я скончыў спартыўную кар'еру ў 2012 годзе, калі заняў шостае месца на Параалімпійскіх гульнях у Лондане. І пасля мяне запрасілі працаваць масажыстам у нашу каманду па лёгкай атлетыцы. Але з выступленнямі я не развітаўся. У 2015 годзе ў якасці трэнера рыхтаваў Аляксандра Трыпуця на Параалімпіяду ў Рыа, працаваў з Юліяй Няжурай, быў масажыстам нацыянальнай каманды і знаходзіў час на свае трэніроўкі. І на чэмпіянат свету ў 2015 годзе я паехаў у трох іпастасях. І ў гэтым жа годзе на Гран-пры заваяваў ліцэнзію для каманды. І гэта была тлустая кропка ў кар'еры. Стала зразумела, што больш я такую нагрузку не пацягну. І зараз мая асноўная дзейнасць — медыцынская работа, і як у трэнера ў мяне не вельмі шмат людзей.

***— Сяргей Міхайлавіч, растлумачце, калі ласка, у чым заключаецца работа спартыўнага фізіятэрапеўта?***

— Насамрэч, называць мяне фізіятэрапеўтам не зусім правільна, гэта не адпавядае беларускай медыцынскай класіфікацыі. У нашых медыцынскіх установах — гэта доктар, які назначае лячэнне, фізіяпрацэдуры, ванны, лячэбную фізкультуру. Я больш займаюся масажам і мануальнай тэрапіяй. Гэта паляпшае кровазварот і лімфазварот, дапамагае псіхалагічна расслабіцца. Быў цікавы прыклад. На Параалімпійскіх гульнях 2014 года біятланіст бег два этапы адной эстафеты. І мне прыйшлося проста на трасе яго «аднаўляць» паміж гэтымі этапамі, часу, канешне, было вельмі мала. Але вопыт быў цікавы. Навошта спартсменам аднаўленне арганізма, і так зразумела. А сёння, калі так востра стаіць праблема допінгу і калі забаронены нават некаторыя вітаміны, роля немедыкаментозных метадаў у падрыхтоўцы спартсменаў значна ўзрастае. І калі правільна іх выкарыстоўваць, то эфектыўнасць трэніровачнага працэсу павялічваецца, адпаведна, паляпшаецца і вынік на спаборніцтвах. Тым больш, зараз столькі новых метадаў і курсаў, былі б магчымасць і час, толькі і вучыўся б, павышаючы кваліфікацыю.

***— Вы расказвалі, што ў сваёй рабоце выкарыстоўваеце метад прыкладной кінезіялогіі. У чым яго сутнасць?***

— Гэты метад заснаваны на мануальным мышачным тэсціраванні, праз якое можна шмат даведацца пра арганізм. Дзякуючы мышачным тэстам, рэфлексам можна зразумець, у якім стане знаходзяцца ўнутраныя органы. І такім чынам падабраць правільны рацыён, медыкаменты ці нават скласці план трэніроўкі. Мышачныя тэсты паказваюць, што робіцца з арганізмам. Паколькі я актыўна «нясу» метад прыкладной кінезіялогіі ў масы, мне хацелася б, каб як мага больш спецыялістаў ім авалодала. На Захадзе гэта ўжо дастаткова распаўсюджаны метад, у нас ён пакуль толькі набірае папулярнасць.

***— Працуючы з параалімпійцамі, напэўна, трэба дасканала ведаць асаблівасці здароўя кожнага, каб правільна пабудаваць работу...***

— За столькі гадоў я ўжо дасканала вывучыў кожнага спартсмена. З фізічнымі асаблівасцямі прасцей, але ж трэба і добра разумець псіхалогію чалавека. Часта кажуць, што ўсе хваробы ад нерваў, але ў тым жа медыцынскім вучылішчы мне не змаглі растлумачыць, як псіхалагічныя праблемы пераходзяць у «механічныя». А калі я пачаў займацца кінезіялогіяй, то зразумеў. Пры сур'ёзных псіхалагічных праблемах, моцных перажываннях мышцы не працуюць так, як трэба. І як пры гэтым можна казаць пра высокія вынікі і рэкорды? Псіхалагічны стан чалавека звязаны з фізічным мацней, чым здаецца на першы погляд. І таму яшчэ адна мая задача як кінезіёлага — накіраваць думкі спартсмена ў правільным кірунку. І лепей гэта рабіць загадзя, да спаборніцтваў. Калі чалавек доўгі час перажывае, хвалюецца, у яго перастройваецца эндакрынная сістэма, мяняецца гарманальны фон. За некалькі дзён цяжка ўсё гэта змяніць. За гады работы я заўважыў, што шмат старых псіхалагічных праблем, нават не звязаных са спортам, праяўляюцца якраз падчас спаборніцтваў. А дзе тонка, там і рвецца.

***— Чалавеку, які не займаецца прафесійным спортам і не рыхтуецца да спаборніцтваў, варта звяртацца да спецыяліста-кінезіёлага?***

— Калі чалавек клапоціцца аб сваім здароўі і хоча ведаць, у якім стане знаходзіцца арганізм, то канешне варта. Кінезіялогія разглядае чалавека комплексна: мышцы, косці, унутраныя органы, біяхімічныя працэсы, псіхалагічны стан. Яна дапамагае знайсці галоўную прычыну парушэнняў. А як вядома, у чалавечым арганізме ўсё звязана паміж сабой. Кінезіялогія дапамагала лячэнню, калі ў мяне хварэла дзіця ці калі хварэў я сам.

***— Чым у першую чаргу павінен валодаць добры масажыст?***

— Добрымі рукамі — яны павінны быць моцныя, сухія і цёплыя. Масажысту, як музыканту, патрэбны талент і прыроджаныя асаблівасці арганізму. Сіла ў руках, як музычны слых: альбо ёсць, альбо няма. У пэўнай ступені можна натрэніраваць рукі, але без таленту вялікага поспеху не будзе. Калі я паступаў у медыцынскае вучылішча, у нас быў прафесійны адбор, і не ўсіх абітурыентаў бралі толькі праз рукі.

***— Сяргей Міхайлавіч, да Параалімпійскіх гульняў у Токіа застаецца менш за год. Як вы са сваімі спартсменамі працуеце з гэтай нагоды?***

— Паколькі трэнерская праца — не асноўная для мяне, падапечных спартсменаў у мяне няшмат. З Юліяй Няжурай рыхтуемся да адбору на Параалімпійскія гульні. У выпадку Юлі перанос Параалімпіяды на год аказаўся на руку. Праўда, яна перанесла каранавірус, які негатыўна паўплываў на яе спартыўную форму. Але, спадзяюся, мы ўсё наверстаем.

У маёй групе працуе мой таварыш Аляксандр Субота, таксама рыхтуецца да адбору на гульні. І я працую з яшчэ адным маладым спартсменам з парушэнням слыху Андрэем Фамянковым.

Канешне, спартсменам цяжка без спаборніцтваў, без іх зніжаецца матывацыя да працы. Нават мяне, вопытнага чалавека і ўжо нядзеючага спартсмена, засмуціла навіна аб пераносе Параалімпійскіх гульняў. Але ж час ідзе і гульні ўсё бліжэй. Спадзяюся, што не адменяць адборачныя спаборніцтвы, бо, шчыра кажучы, зараз мы жывём толькі імі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ЛАКДАЎН ПА-КІЕЎСКУ

## Чым адметныя «каранцінныя вакацыі» ва Украіне?

**Адразу пасля праваслаўных Каляд ва Украіне запушчаны рэжым татальнага лакдаўна. «Увядзенне жорсткага каранціну неабходна для памяншэння колькасці хворых як на каранавірус, так і на сезонны грып для зніжэння нагрузкі на бальніцы», — растлумачыў прэзідэнт краіны Уладзімір Зяленскі. Пра гэта паведаміў obozrevatel.com. Паводле слоў украінскага лідара, адначасова з гэтым паскараецца атрыманне «якаснай зарэгістраванай вакцыны, ухваленай СААЗ». Як адзначыў Зяленскі, цяперашні лакдаўн будзе больш мяккі ў параўнанні з уведзеным летась вясной, калі пачала разгортвацца пандэмія. Тым не менш эксперты мяркуюць аб пэўных эканамічных наступствах абмежаванняў і канстатуюць непаслухмянасць украінцаў. Чым адметныя студзеньскія «каранцінныя вакацыі» ва Украіне?**

### Канцы з канцамі

Фактычна гэта трэці лакдаўн ва Украіне за няпоўны год. Пра веснавыя абмежаванні ўжо згадвалася. З сярэдзіны лістапада ўкраінскімі ўладамі быў уведзены так званы каранцін выхаднога дня. Абмежаванні, аналагічныя сакавіцкім (за выключэннем работы транспарту і авіяперавозак), дзейнічалі толькі ў выхадныя. Урад вырашыў не працягваць гэтыя меры ў снежні ў сувязі з паляпшэннем эпідэмічнай сітуацыі, аднак ужо з сярэдзіны мінулага месяца колькасць людзей, якія заразіліся каранавірусам, і колькасць памерлых ад ковіду ў краіне стала павялічвацца.

Са снежня ва Украіне дзейнічалі абмежаванні «аранжавай зоны». У прыватнасці, пад забаронай апынуліся канцэрты, спартыўныя, сацыяльныя і іншыя мерапрыемствы з больш чым 20 удзельнікамі, за выключэннем матчаў гульнявых відаў спорту, якія праводзіліся без гледачоў. Не працавалі начныя клубы, хостэлы, турбазы, ноччу ўстановам грамадскага харчавання было дазволена працаваць толькі на дастаўку. Акрамя таго, кінатэатрам і тэатрам прадпісвалася быць запоўненымі не больш чым напалову.

Але нават такая «лайт-версія» лакдаўна выклікала хвалю абурэння ў грамадстве. Прадпрымальнікі, якія ў апошні год ледзь зводзяць канцы з канцамі, патрабавалі даць ім магчымасць працаваць. Украінскія бізнесмены патрабавалі ад уладаў спыніць лакдаўн і прыняць законапраекты аб спрошчанай сістэме падаткаабкладання.

Пратэсная хваля захліснула вуліцы ўкраінскіх гарадоў. Не абышлося без сутыкненняў — напрыклад, падчас снежаньскай «антыкаранціннай» акцыі ў Кіеве пацярпела каля 40 паліцэйскіх. Ва ўкраінскай сталіцы прайшоў шматлікі пратэст прадпрымальнікаў, якія патрабавалі адмяніць лакдаўн і ўнесці змены ў заканадаўства аб фінансавай справаздачнасці. Акцыя пачалася каля будынка Вярхоўнай Рады, адтуль пратэстоўцы накіраваліся да офіса прэзідэнта Украіны, а затым — на Майдан Незалежнасці.

Тут адбыліся жорсткія сутыкненні дэманстрантаў з паліцэйскімі. Яны распачаліся пасля таго, як паліцэйскія перашкодзілі некаторым удзельнікам пратэсту ўстанавіць палаткі, паведаміла інфармагенцтва УНІАН. Па словах пратэстоўцаў, паліцэйскія ўжылі слёзатачывы газ і прымянілі сілу, некалькі чалавек атрымалі траўмы. У сваю чаргу нацыянальная паліцыя паведаміла, што падчас сутыкненняў каля 40 праваахоўнікаў атрымалі апёкі вачэй, яшчэ адзін ад удару па галаве страціў прытомнасць. У ходзе пратэсту дэманстранты блакавалі рух аўтатранспарту, паліцыя перакрывала рух па вуліцы Крашчацік ад Еўрапейскай плошчы да вуліцы Прарэзнай.

Мэры васьмі гарадоў, у тым ліку Львова, Дняпра і Адэсы, публічна адмовіліся выконваць рашэнне ўрада. Цэнтральныя ўлады аказаліся не ў сілах паставіць рэгіянальных гораданачальнікаў на месца. Прэм'ер-міністр Дзяніс Шмыгаль вымушаны быў прызнаць: каранцін выхаднога дня не даў належнага эфекту. А напросту — праваліўся, адзначыла Deutsche Welle.

Рашэнне ўладаў вызваліць індывідуальных прадпрымальнікаў ад выплаты адзінага сацыяльнага ўзносу на перыяд каранціну, а таксама выплаціць тым, хто вымушаны быў закрыць свой бізнес, разавую дапамогу ў 8000 грыўняў (250 еўра ў пераліку) сітуацыю кардынальна не змяніла. Пра тое, што насамрэч тады думалі ва ўрадзе, расказала намеснік міністра аховы здароўя Ірына Мікічак, якая парэкамендавала ўкраінцам, якія страцілі бізнес, пайсці працаваць у бальніцы, дзе цяпер адзначаецца вялікі дэфіцыт рабочых рук.




Разнастайныя варыянты абмежавальных мер моцна ўдарылі па ўкраінскай эканоміцы. Чакалася, што ў 2020 годзе ВУП вырасце на 4,5 %, замест гэтага паказчык упаў на 6 %. Яшчэ большае падзенне фіксуецца ў ключавых галінах — прамысловасці, аграрным сектары. Беспрацоўе ў пачатку мінулага года складала заўважныя 9,6 %, да канца года яно дасягнула рэкордных 15,4 %. Дэфіцыт бюджэту за першыя 10 месяцаў у чатыры разы перавысіў адпаведны паказчык за такі ж перыяд 2019-га.

У мінулым месяцы палітыкі ўсур'ёз абмяркоўвалі магчымы дэфолт. «Калі мы не атрымаем транш МВФ, то будзе катастрофа. Будзе рэальная пагроза адстаўкі ўрада і секвестру. Гэта цалкам рэальна. Калі ў верасні 2021-га мы не пагасім тры мільярды долараў пазыкі, то наступіць тэхнічны дэфолт. І адразу апакаліптычны сцэнарый», — папярэджваў намеснік кіраўніка камітэта Рады па пытаннях фінансаў Яраслаў Жалязняк.

### Урачы — у роспачы

Тым не менш, нягледзячы на заўважную незадаволенасць у грамадстве ўвядзеннем абмежавальных мер і адчувальныя эканамічныя страты, украінскія ўлады вырашылі ўсё ж увесці каранцін з 8 да 24 студзеня. Адна з галоўных прычын — сітуацыя ў галіне аховы здароўя, якая падчас падвышаных нагрузак з-за пандэміі відавочна працуе на мяжы магчымасцяў. Як было заяўлена, абмежаванні ўводзяцца, «каб не дапусціць калапсу медыцынскай сістэмы». Дарэчы, гэтыя значныя праблемы не хаваюць улады. Рэформа аховы здароўя ў краіне аказалася правальнай, прызнаў прэзідэнт Украіны. У снежні ў інтэрв'ю часопісу «Фокус» Уладзімір Зяленскі заявіў: пандэмія паказала, што ў краіне няма сістэмнай медыцыны.

Украінскія ўрачы атрымліваюць мізэрныя заробкі. А краіны Еўрасаюза з-за недахопу медперсаналу, які асабліва адчувальны падчас пікавых нагрузак на сістэму ў пандэмію каранавіруса, спрашчаюць працаўладкаванне замежных медыкаў. У такой сітуацыі Украіне рэальна пагражае масавы адток спецыялістаў.

Заробкі ўкраінскім медыкам трэба тэрмінова падняць — гэта прызнае і міністр аховы здароўя краіны Максім Сцяпанаў, які заявіў, што яны знаходзяцца «на ўзроўні выплат па беспрацоўі». Калі ўрачам не падвысяць зарплату, «яны паедуць за мяжу», папярэдзіў кіраўнік Міністэрства аховы здароўя.

У бюджэтным запісе на 2021 год міністэрства заклала зарплаты для ўрачоў у памеры 23 тысяч грыўняў (каля 660 еўра), 17 тысяч грыўняў (прыкладна 490 еўра) для медсясцёр, 12 тысяч грыўняў (каля 345 еўра) — для санітарак. У цэлым Міністэрства аховы здароўя прасіла закласці ў дзяржаўны бюджэт на патрэбы медыцынскай сферы 300 мільярдаў грыўняў (больш за 8,6 мільярда еўра). Аднак у праекце бюджэту на наступны год урадам Украіны прадугледжана ўсяго толькі прыкладна палова ад гэтай сумы.

Таму ўлады абгрунтавана асцерагаюцца, што, напрыклад, спрашчэнне польскімі ўладамі працэдуры працаўладкавання ўкраінскіх медыкаў прывядзе да масавага адтоку медперсаналу за мяжу. Пра тое, што ўкраінскія медработнікі «асабліва пасля ковіду сталі магнітам для ўсіх еўрапейскіх краін», папярэдзіў і кіраўнік украінскага Міністэрства аховы здароўя. Ад'езд спецыялістаў можа выклікаць недахоп на Украіне лекараў, медсясцёр і іншага медыцынскага персаналу. У сістэме аховы здароўя асабліва асцерагаюцца, што ўзмоцніцца дэфіцыт інфекцыяністаў і анестэзіёлагаў.

Як заўважыў прэзідэнт Сусветнай федэрацыі ўкраінскіх урачэбных таварыстваў Андрэй Базілевіч, значныя цяжкасці з працаўладкаваннем у маладых медыкаў. «Праблемы ў маладых урачоў пачынаюцца яшчэ на шляху ў інтэрнатуру. Пасля атрымання дыплома выпускнік медыцынскай ВНУ павінен знайсці галоўнага ўрача, які захоча яго ўзяць і выдзеліць яму стаўку на тры гады. А такіх ставак няма. Маладыя ўрачы — у роспачы. Таму я разумею тых маладых людзей, якія выязджаюць за мяжу», — заўважыў Андрэй Базілевіч.



### «Нельга, дачушка, цацку, можна гарэлку»

Студзеньскі каранцін аказаўся не такі жорсткі, як увесну мінулага года. Але з не менш недарэчнымі абмежаваннямі, адзначае Deutsche Welle. Напрыклад, на продаж у супермаркетах лямпачак, батарэек, шкарпэтак і трусоў. Украінскі блогер Андрэй Луганскі высмеяў уведзены ў яго краіне парадак, калі харчовыя тавары купляць можна, а ўсе астатнія — пад забаронай. Адпаведнае відэа блогер выклаў на YouTube. Каб расказаць пра тое, як праходзіць лакдаўн, Луганскі прыйшоў у супермаркет, дзе паліцы з прадуктамі адкрытыя, а на прылаўках з прамтаварамі вісяць забаронныя значкі і стужкі.

У рэальных дэкарацыях блогер разыграў некалькі гіпатэтычных сцэнак з удзелам розных пакупнікоў, піша ukraina.ru. Напрыклад, як нехта спрабуе набыць пантофлі, аловак для пісьма, дэзадарант або сродкі кантрацэпцыі, але чуе на ўсе пытанні ад прадаўца адзін і той жа адказ: «Гэта нельга, можна гарэлку». Прадставіў Луганскі і паход у такую краму з дзецьмі.

«Тата, тата, купі мне мыльныя бурбалкі». «Не, каранцін жа цяпер», — кажа тата, бярэ тры бутэлькі гарэлкі і ідзе на касу. «Тата, а купі мне такога поні ружовага!» «Не, сынок, не, дачушка, гарэлку можна, а гэта нельга!» — распавядае Луганскі. «Гэта не лакдаўн, а клаўнада», «маразм зашкальвае, і не разумееш ужо — смяяцца ці плакаць», «гарэлка і цыгарэты — найлепшыя лячэбныя сродкі ад ковіду», — ацанілі ролік падпісчыкі.

«Мабыць, самым абсурдным стала рашэнне ўрада дазволіць працаваць падчас каранціну гарналыжным курортам. У выніку на дарогах у бок Карпат выстраіліся шматкіламетровыя чэргі з аўтамабіляў. У Букавелі, які традыцыйна прымае ў сезон больш за мільён гасцей, пануе ажыятаж. А ў цэнтры ўвагі апынуўся прэзідэнт Уладзімір Зяленскі — ён пазіраваў у лыжным касцюме і без медыцынскай маскі. Тое, што адбываецца цяпер на гарналыжных курортах Украіны, цалкам дыскрэдытуе ідэю каранціну. Можна бясконца патрабаваць ад малога бізнесу, напрыклад, зачыніць кавярні, а ўсім украінцам забараніць купляць ніжнюю бялізну ў супермаркетах. Але адной фатаграфіі Зяленскага з Букавеля цалкам хопіць для таго, каб разбурыць давер грамадзян да дзяржавы і яе інстытутаў», — заўважае калумніст Deutsche Welle.

### У прадчуванні калапсу

Татальны каранцін ва Украіне — сумнеўная мера, перакананы эксперты. Поўны лакдаўн ва Украіне не з'яўляецца найлепшым рашэннем у барацьбе з каранавірусам, заявіў дырэктар Еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) Ханс Клюге. «Я думаю, што цяпер мы ўсё яшчэ ў разгары пандэміі... У сакавіку і красавіку сітуацыя была некалькі іншай. Тады мы гаварылі пра лакдаўн. Мы значна скарацілі ўплыў віруса, але, на жаль, лакдаўн нанёс шкоду многім людзям. Цяпер мы сталі нашмат больш спрактыкаванымі ў нашых ведах і выкарысталі тое, што мы называем шматузроўневым падыходам. Гэта значыць, з кожным разам мы ўжываем больш строгія падыходы, а не «усё ці нічога»... Так што калі ў вас поўны лакдаўн, гэта абсалютна не найлепшая сітуацыя», — заявіў Клюге ў інтэрв'ю агенцтву «РБК-Украина».

Паводле яго слоў, поўны лакдаўн не ўлічваў патрэбы розных катэгорый людзей. Ханс Клюге адзначыў, што галоўнае — не жорсткасць абмежавальных мер, а іх безумоўнае захаванне. «Людзі губляюць прыбытак. Ім патрэбна макраэканамічная падтрымка. Далей, калі школы зачыняцца, то дзеці з інваліднасцю не змогуць скарыстацца лічбавым інструментарыем. І людзі з іншымі захворваннямі, такімі як рак, сардэчна-сасудзістыя захворванні, таксама маюць патрэбу ў лячэнні. Вось чаму больш мяккі, паступовы падыход лепшы», — перакананы эксперт СААЗ.

Украінскія ўлады вырашылі «прыдушыць» народ новым каранцінам і рэзкім павышэннем цэн на жыллёва-камунальныя паслугі, лічыць дырэктар Інстытута развіцця эканомікі Украіны Аляксандр Ганчароў. «Такое адчуванне, што нашы ўлады цвёрда ўзялі курс на тое, каб у краіне хутчэй наступіў калапс плацежаздольнасці не толькі грамадзян, але і ўкраінскага бізнесу. І для паскарэння гэтага працэсу падганяюць лакдаўн, які павінен яшчэ больш дабіць нацыянальную сферу паслуг і гандаль», — заўважыў эксперт у артыкуле для glavred.info. Ганчароў адзначыў, што ў гэтых эканамічных сектарах занята велізарная колькасць грамадзян, і яны вымушана застануцца без працы і заробку.

Уладам ва Украіне трэба адмяніць лакдаўн і вярнуцца да работы для аднаўлення эканомікі краіны. Пра гэта гаворыцца ў заяве ўкраінскай партыі «Апазіцыйная платформа — За жыццё» (АПЗЖ), апублікаванай днямі на сайце палітсілы, паведаміла ukraina.ru. «Замест таго, каб з першых дзён года вырашаць назапашаныя праблемы, яна (улада. — **Рэд.**) проста вырашыла падоўжыць сабе каляндарныя вакацыі, саслаўшы Украіну на чарговы лакдаўн». АПЗЖ «патрабуе ад Зе-каманды выйсці з прыдуманых вакацый, вярнуцца з гарачых краін, гарналыжных курортаў, адзін дзень адпачынку на якіх каштуе больш, чым сярэдняя пенсія ва Украіне», — гаворыцца ў заяве партыі.

**Пётр ДУНЬКО.**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
# «Призы от Виталюр для него и для нее!»

В настоящих правилах проведения рекламной игры «Призы от Виталюр для него и для нее!» (далее – Правила) нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

**Карта «Виталюр»** – идентификатор (инструмент) участника программы лояльности ОДО «Виталюр» в виде активной пластиковой карты лояльности «Виталюр» с нанесенным на нее уникальным идентификационным номером «Виталюр» (далее – Номер карты «Виталюр»), эмитированной ОДО «Виталюр» в том числе для функционирования программы лояльности ОДО «Виталюр».

**Карта «Моцная картка»** – идентификатор (инструмент) участника программы лояльности ОДО «Виталюр» в виде активной пластиковой карты «Моцная картка» с нанесенным на нее уникальным идентификационным номером (далее – номер карты «Моцная картка») и зарегистрированной в системе Программы лояльности ОДО «Виталюр», эмитированной ОАО "Белинвестбанк", ОАО «Белагропромбанк», ОАО «БПС-Сбербанк», ЗАО «Идея-Банк», ОАО «Банк БелВЭБ», ЗАО «Альфа-Банк», ЗАО «БСБ Банк», ОАО «Технобанк», ОАО «Паритетбанк», ЗАО «Банк «Решение», ЗАО «РРБ-Банк», в том числе для функционирования программы лояльности ОДО «Виталюр».

**Персональные данные** – совокупность личных данных физического лица, которые необходимо зарегистрировать (или проверить) на Интернет-сайте www.vitalur.by, а именно:

- фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно, при наличии);
- адрес пребывания/проживания в Республике Беларусь: населенный пункт (обязательно), улица (обязательно, при наличии), дом (обязательно, при наличии), корпус (обязательно, при наличии), номер квартиры (обязательно, при наличии);
- адрес электронной почты (обязательно);
- абонентский номер мобильного телефона Участника в сети белорусского оператора сотовой связи в международном формате (обязательно).

**Интернет-сайт** – www.vitalur.by

**1. Организатором рекламной игры** является Общество с ограниченной ответственностью «ЭфСиБи Бел» (далее – Организатор), УНП 193185741.

Юридический адрес: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Козлова, 25, пом. 22.

Электронный адрес: info_igra@mail.ru

**2. Наименование рекламной игры:** «Призы от Виталюр для него и для нее!»

**3. Территория проведения игры**: магазины «Виталюр» на территории Республики Беларусь (далее – магазины «Виталюр»).

**4. Срок начала и окончания рекламной игры,** включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения рекламной игры: с 20 января 2021 года по 31 марта 2021 года.

**5. Состав комиссии по проведению рекламной игры:**

Председатель комиссии:

Кривоногова Надежда Александровна – ведущий специалист по работе с клиентами ООО «ЭфСиБи Бел»;

Члены комиссии:

Казак Вадим Анатольевич – специалист по рекламе ООО "Адверком»;
Бакач Татьяна Николаевна – специалист по рекламе ООО «ЭфСиБи Бел»;
Корпик Екатерина Игоревна – специалист по рекламе ООО «ЭфСиБи Бел»;
Кубицкий Борис Дмитриевич – специалист по рекламе ООО «ЭфСиБи Бел».

**6. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится рекламная игра:** товары, перечисленные в таблице 1 настоящего пункта (далее – Игровой товар), реализуемые в магазинах «Виталюр» на территории Республики Беларусь в период с 20 января 2021 года по 17 марта 2021 года включительно.

Таблица 1. **Игровые товары**

| № | Наименование Игрового товара |
|---|---|
| 1 | Продукт из свинины МАЛАДЗЕЧНА «Грудинка Особая» к/в (в/у) |
| 2 | Изделие колбасное МАЛАДЗЕЧНА «Колбаса «Студенческая» мясорастительная, вар. (МГС) |
| 3 | Вареное колбасное изделие мясное. Колбаса МАЛАДЗЕЧНА «Мортаделла люкс» в/с |
| 4 | Вареное колбасное изделие мясное Сардельки МАЛАДЗЕЧНА «Ветчинные» мясные, высший сорт (МГС) |
| 5 | Сосиски из мяса птицы МАЛАДЗЕЧНА «Гриль-Мастер», высший сорт вар. (МГС) |
| 6 | Изделие колбасное салями МАЛАДЗЕЧНА Колбаса «Сервелат Венгерский» мясная, высший сорт в/к (в/у), 0,38 кг |
| 7 | Изделие колбасное салями МАЛАДЗЕЧНА «Колбаса Сервелат Финский» мясная высший сорт в/к (в/у), 0,38 кг |
| 8 | Вареное колбасное изделие мясное Сардельки МАЛАДЗЕЧНА «Свиные» мясные в/с (МГС) |
| 9 | Изделие колбасное мясное МАЛАДЗЕЧНА «Колбаса ливерная Столовая» из термич. обраб. ингр-в вар. (МГС) |
| 10 | Продукт из свинины МАЛАДЗЕЧНА «Рулет Застольный» мясной к/в |
| 11 | Изделие колбасное мясное МАЛАДЗЕЧНА «Колбаса Брестская» мясное, высший сорт в/к (в/у) |
| 12 | Продукт из свинины МАЛАДЗЕЧНА «Ветчина Императорская» мясн. срез с/к (вакуум) |
| 13 | Изделие колбасное Колбаса салями МАЛАДЗЕЧНА «Мадера» мясное, высший сорт с/в (МГС) |
| 14 | Вареное колбасное изделие мясное Сосиски МАЛАДЗЕЧНА «Молочные» в/с (МГС) |
| 15 | Изделие колбасное Колбаса салями МАЛАДЗЕЧНА «Сервелат Венгерский» мясн. в/с в/к (МГС) |
| 16 | Вареное колбасное изделие из мяса птицы. Сосиски МАЛАДЗЕЧНА «Карапузики» в/с (МГС) 0,32 кг |
| 17 | Напиток энергетический БіОЛА «ENERGO», обогащенный витаминами, газированный, безалкогольный (ПЭТ) 0,5 л |
| 18 | Напиток энергетический БіОЛА «ENERGO COOL EFFECT», обогащенный витаминами, газированный, безалкогольный (ПЭТ), 0,5 л |
| 19 | Нектар БіОЛА «ЛІТО» яблочный, осветленный, пастеризованный, пэт/б, 0,9 л |
| 20 | Нектар БіОЛА «ЛІТО» яблоко-виноград, осветленный, пастеризованный, пэт/б, 0,9 л |
| 21 | Нектар БіОЛА «ЛІТО» томатный с солью пастер. пэт/б 0,9 л |
| 22 | Нектар БіОЛА «ЛІТО» мультифруктовый неосветленный пэт/б, 0,9 л |
| 23 | Полуфабрикат в тесте мясосодерж. Пельмени ДОБРОВСКИЙ «Настоящие», зам., 900 г |
| 24 | Полуфабрикат. Пельмени ДОБРОВСКИЙ «Настоящие» (заморож.), 0,4 кг |
| 25 | Полуфабрикат в тесте мясосодерж. Пельмени ДОБРОВСКИЙ «Отборные», зам., 400 г |
| 26 | Полуфабрикат в тесте мясосодерж. Пельмени ДОБРОВСКИЙ с говядиной и свининой (заморож.), 0,4 кг |
| 27 | Полуфабрикат в тесте мясосодержащий. Пельмени ДОБРОВСКИЙ с говядиной, зам., 400 г |
| 28 | Полуфабрикат в тесте мясосодерж. Пельмени ДОБРОВСКИЙ «Тимка» (заморож.), 0,4 кг |
| 29 | Полуфабрикат в тесте мясосодерж. Пельмени ДОБРОВСКИЙ WORLD OF TANKS «Боевой паек», зам., 400 г |
| 30 | Полуфабрикат в тесте мясосодерж. Пельмени ДОБРОВСКИЙ WORLD OF TANKS «Победные», зам., 400 г |
| 31 | Полуфабрикат в тесте мясосодерж. Пельмени ДОБРОВСКИЙ ручной лепки со свининой и говядиной, 420 г |
| 32 | Полуфабрикат. Пельмени ДОБРОВСКИЙ ручной лепки с филе индейки, 420 г |
| 33 | Полуфабрикат в тесте мясосодерж. Манты ДОБРОВСКИЙ «Восточные» (заморож), 0,8 кг |
| 34 | Полуфабрикат в тесте мясосодерж. Хинкали ДОБРОВСКИЙ по-грузински (заморож), 0,8 кг |
| 35 | Шампунь и бальзам-ополаскиватель HEAD & SHOULDERS 2 в 1 Ментол, против перхоти, 400 мл |
| 36 | Шампунь и бальзам-ополаскиватель HEAD & SHOULDERS 2 в 1 Основной уход против перхоти, 400 мл |
| 37 | Шампунь HEAD & SHOULDERS против перхоти, Глубокое увлажнение, 400 мл |
| 38 | Шампунь HEAD & SHOULDERS Old Spice против перхоти 400 мл |
| 39 | Шампунь HEAD & SHOULDERS Supreme Укрепление Масло Арганы против перхоти, 300 мл |
